ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 231 (28847)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
+TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Мы прапрацоўваем комплексныя падыходы па тарыфах на электраэнергію. Абмяркоўваецца пытанне аб адмене дыферэнцыраванай платы за электраэнергію ў залежнасці ад аб'ёмаў спажывання. Акрамя таго, мяркуецца разгледзець і ўнесці дадатковыя прапановы па тарыфах, накіраваныя на павелічэнне электраспажывання, у тым ліку для мэт ацяплення. Электраэнергію прапануецца выкарыстоўваць для ацяплення ў першую чаргу шматкватэрных жылых дамоў. Пакуль вывучаецца эканамічны бок пытання. Зараз асноўная задача — паглядзець і ўнесці прапановы па адпаведным узроўні тарыфаў пры выкарыстанні электраэнергіі для ацяплення. Усе пытанні па прапанаваных тарыфах павінны быць вырашаны да 1 студзеня 2019 года».*

# ЗАБЛІШЧЫЦЬ ШАРАМІ ЁЛКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



На Кастрычніцкай плошчы сталіцы заканчваецца ўпрыгожванне галоўнай ёлкі краіны. У развешванні люстраных шароў (сёлета гэтых навагодніх цацак будзе болей за тры тысячы штук) задзейнічаны чатыры мантажнікі прадпрыемства «Мінскрэклама», якіх падымаюць на трыццаціметровую вышыню спецыяльныя аўтавышкі. Пяты год працуе на падрыхтоўцы горада да свята мантажнік рэкламных канструкцый Анатоль ЛЕБЕДЗЕЎ *(на фота)*.

***Больш здымкаў з гэтай падзеі можна глядзець на сайце «Звязды».***

## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Саламэ Зурабішвілі з абраннем на пасаду Прэзідэнта Грузіі.**

• Нацбанк Беларусі ў 2019 годзе плануе зняць абмежаванні на адкрыццё фізічнымі асобамі рахункаў у замежных банках.



• **У Мінскай вобласці па выніках дзевяці месяцаў 2018 года створана больш за 8,5 тыс. рабочых месцаў.**

• Зборная Беларусі па футболе займае 76-е месца ў лістападаўскім рэйтынгу ФІФА.

• **У краіне зарэгістравана больш за 20,5 тыс. ВІЧ-інфіцыраваных.**

ISSN 1990 - 763X

Сацыяльны клопат

## ДА РОЎНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

### Сярэдняя працоўная пенсія па інваліднасці — 347 рублёў

**Сёння ў нашай краіне пражываюць 568 тысяч людзей з інваліднасцю, у тым ліку 31,7 тысячы дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў. На жаль, колькасць людзей з асаблівасцямі развіцця з кожным годам расце. І перад дзяржавай стаіць задача забяспечыць ім спрыяльныя магчымасці для жыцця і развіцця — толькі тады мы зможам паўнапраўна называцца грамадствам роўных магчымасцяў.**

Многія людзі з інваліднасцю з прычыны абмежаванняў па здароўі не могуць працаваць, таму важным элементам сацыяльнай падтрымкі для іх з'яўляюцца дзяржаўныя дапамогі. Асноўны прыбытак інвалідаў — пенсія. «Сярэдні памер працоўнай пенсіі па інваліднасці ў лістападзе гэтага года склаў каля 347 рублёў. Столькі атрымлівае чалавек, які мае працоўны стаж, але, атрымаўшы інваліднасць, ужо не працуе. Інвалідам з дзяцінства выплачваюць сацыяльную пенсію — у сярэднім каля 205 рублёў», — расказаў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.**

Ён таксама адзначыў, што сярод дапамог для сем'яў з дзецьмі немалую частку складаюць выплаты сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. «Акрамя таго, летась была дадзена магчымасць працаваць на паўстаўкі бацькам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда», — дадаў намеснік міністра.

СТАР. 4

Ракурс

## ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

**Некалькі разважанняў пасля наведвання бальніцы сястрынскага догляду**

**Такія бальніцы цяпер ёсць у кожным раёне. Сюды змяшчаюць людзей, найбольш састарэлых, якія ўжо не могуць даглядаць сябе самі. Зараз у Вялікарыцкай бальніцы сястрынскага догляду, што на Брэстчыне, знаходзяцца 17 чалавек. Кожны з іх нясе ў сабе сваю гісторыю жыцця і старасці, гісторыю болю і пакут. Кіраўнік гэтай установы старшая медсястра Галіна ПАЛІШЧУК стала на гэтай рабоце ў нейкай меры філосафам.**



### КАЛЕКТЫЎ

Галіна Іванаўна шмат гадоў адпрацавала ў звычайнай участковай бальніцы. А калі яе закрылі і зрабілі, па сутнасці, сацыяльнай установай, засталася тут. Кажа, што пасля 12 гадоў працы ў новай установе яна па-іншаму стала глядзець на жыццё. Стараецца нікога не асуджаць, нават дзяцей тых, хто тут ляжыць. «Жыццё такое пакручастае, — кажа яна. — І ніхто ні ад чаго не застрахаваны. Тут за дзень пяць разоў зменіш уласнае меркаванне.

То здаецца, лёс зусім несправядлівы: вось ляжыць бабулечка, такая мілая, выхаваная, чысцюля па натуры, вясковая інтэлігентнасць у яе недзе ад прадзедаў. І чаму яна тут? Сэрца кроўю абліваецца, здаецца, забрала б дадому... Адыдзеш на два крокі, а там пацыент, якога санітарка даглядае, лаецца на яе апошнімі словамі. Крыўдна. І ловіш сябе на крамольнай думцы, што вось ён, лёс, аддае належнае чалавеку. Так што лепш глыбока не задумвацца над законамі быцця, а проста рабіць сваю справу».

СТАР. 4

# З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю расійскаму федэральнаму дзяржаўнаму інфармацыйнаму тэлеканалу «Россия 24». У якасці інтэрв'юера выступіў намеснік дырэктара тэлеканала Сяргей Брылёў, вядомы тэлевядучы.**

Размова адбылася ў рамках цыкла інтэрв'ю з кіраўнікамі дзяржаў ЕАЭС, выхад якога запланаваны на канале «Россия 24» на наступным тыдні, напярэдадні Санкт-Пецярбургскага саміту кіраўнікоў дзяржаў «пяцёркі». Яшчэ адна нагода для гутаркі — нядаўняя сустрэча прэм'ераў краін Еўразійскага эканамічнага саюза ў Мінску. Акрамя таго, расійскі тэлевядучы растлумачыў беларускім калегам, што ў яго журналісцкай біяграфіі асоба беларускага лідара звязана з еўразійскай інтэграцыяй, бо пасля падпісання Дагавора аб ЕАЭС у Маскве ён запісаў інтэрв'ю якраз з Аляксандрам Лукашэнкам.

Інтэрв'ю з кіраўніком Беларусі будзе выкарыстана на каналах Усерасійскай дзяржаўнай тэлевізійнай і радыёвяшчальнай кампаніі ў двух фарматах: акрамя выхаду ў класічным выглядзе на канале «Россия 24», яго таксама часткова можна будзе ўбачыць ужо 1 снежня ў праграме «Весці ў суботу» на тэлеканале «Россия 1» у сукупнасці з рэпартажам з Беларусі.

Інтэрв'юер адзначыў, што размова з беларускім лідарам як заўсёды была надзвычай цікавая. «Калі гаворка ідзе аб пераломных момантах або важных этапах, як зараз у Еўрапейскім саюзе, ён сапраўды ідэальны субяседнік», — падкрэсліў Сяргей Брылёў.

Тэмамі інтэрв'ю, акрамя ЕАЭС, былі таксама Беларусь, драйверы яе эканамічнага росту і геапалітычная абстаноўка ў свеце. Размова з расійскім журналістам доўжылася каля паловы гадзіны, асобныя яе элементы можна будзе ўбачыць і на беларускіх тэлеканалах, у іншых СМІ.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ВАМ АДКАЖУЦЬ КАМПЕТЭНТНЫЯ АСОБЫ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 1 снежня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў краіны з 9 да 12 гадзін адкажуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатольевіч КЛЕЦ. Тэл. 8-016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8-021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Андрэевіч ДВОРНІК. Тэл. 8-023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8-015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8-022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8-017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Пятровіч КРЭПАК. Тэл. 8-017 222 44 44.

# НАГНАЦЬ УПУШЧАНАЕ

### У размове з паслом Узбекістана Прэзідэнт Беларусі задаў хуткасць па нарошчванні ўзаемнага супрацоўніцтва

**Учора ў Палацы Незалежнасці Аляксандр Лукашэнка прымаў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Насірджана Юсупава. Гэта сустрэча стала своеасаблівым працягам нядаўніх дамоўленасцяў паміж кіраўніцтвам дзвюх краін. У верасні Прэзідэнт Беларусі з афіцыйным візітам наведаў Ташкент, па выніках візіту кіраўнікамі ўрадаў была падпісана дарожная карта па развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Узбекістанам і яшчэ каля двух дзясяткаў двухбаковых пагадненняў і дакументаў.**

Трэба сказаць, што сама вераснёўская сустрэча стала лагічным працягам дынамікі, якую набыло ўзаемадзеянне дзвюх краін у апошнія два гады. Аляксандр Лукашэнка звязаў прыкметнае паляпшэнне ў партнёрскіх адносінах з палітыкай цяперашняга Прэзідэнта Узбекістана. Пра гэта ён сказаў і на сустрэчы з паслом Насірджанам Юсупавым.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што супрацоўніцтва Беларусі з дружалюбным Узбекістанам развіваецца вельмі добра і інтэнсіўна. «Самы галоўны вынік усяго гэтага, што мы нагналі тое адставанне ў нашым супрацоўніцтве, якое назапасілася за папярэднія гады. Я ўжо казаў вашаму прэзідэнту, што гэта ў асноўным яго заслуга», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Адносна нядаўна зацверджанай дарожнай карты па развіцці супрацоўніцтва кіраўнік Беларусі запэўніў, што асабіста будзе кантраляваць яе выкананне. Ён папрасіў пасла перадаць кіраўніку Узбекістана, што Беларусь «прыхільная поўнай рэалізацыі гэтага плана».

Аляксандр Лукашэнка запрасіў прэзідэнта Узбекістана наведаць нашу краіну ў любы зручны для яго час. «Мы яго будзем сустракаць як нашага не проста сябра, гэта наш брат, чалавек, які вельмі любіць Беларусь. Гэта мяне заўсёды падкупляе, і ён сапраўды шчыра адносіцца да Беларусі, бо добра ведае нашу краіну. Мы для вас будзем заўсёды надзейным партнёрам, і закрытых тэм для супрацоўніцтва няма. Многае ўжо распачата, і многае яшчэ зробім», — запэўніў Прэзідэнт узбекскага пасла.

Насірджан Юсупаў падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за высокую ацэнку і шчырыя словы. «Гэта вялікі гонар сёння быць прынятым вамі, — сказаў ён. — Гэта павага да маёй краіны, да майго прэзідэнта. Я, як пасол, лічу сваёй асноўнай задачай прыкласці ўсе намаганні для таго, каб паспяхова выконваць усе тыя пытанні, якія былі паднятыя на нашай сустрэчы ў верасні ў Ташкенце. Дарожная карта, якая была распрацавана ў адпаведнасці з вашымі ўказаннямі, ужо пачала рэалізоўвацца».

* * *

Пасол Узбекістана абазначыў журналістам некалькі пытанняў, якія былі абмеркаваныя падчас гутаркі з беларускім лідарам.

«Хоць прайшло няшмат часу, але Аляксандр Рыгоравіч лічыць, што мы павінны надаць імпульс вырашэнню ўсіх тых задач і пытанняў, якія былі абгавораны на вераснёўскай сустрэчы ў Ташкенце. Узбекскі бок да гэтых пытанняў падыходзіць дакладна гэтак жа», — сказаў ён.

Пасол Узбекістана заўважыў, што ўжо маюцца пэўныя вынікі: значна вырас таваразварот паміж Беларуссю і Узбекістанам, у параўнанні з мінулым годам у два з паловай разы павялічылася колькасць узбекскіх студэнтаў, якія навучаюцца ў Беларусі. «У цэлым гэта вельмі перспектыўны кірунак і гэта тэндэнцыя будзе, канешне, захаваная ў наступныя гады», — упэўнены дыпламат.

Кіраўнік узбекскай місіі адзначыў вельмі сяброўскую і шчырую абстаноўку, у якой праходзіла гутарка з беларускім Прэзідэнтам.

На пытанне журналістаў, калі можна чакаць узбекскага лідара ў Беларусі, спадар пасол адказаў: «У студзені будзе вызначаны графік нашага прэзідэнта. На наступны год сустрэча адбудзецца, і гэта будзе першы афіцыйны візіт кіраўніка нашай дзяржавы ў Беларусь. Мы зараз да гэтага вельмі дасканала рыхтуемся, беларускі бок таксама».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ЛЕСІКА

### Учора грамадскасці быў прадстаўлены талісман II Еўрапейскіх гульняў

**Ім стала лісяня — Лесік. З гэтага часу менавіта Лесік з'яўляецца візуальным вобразам, які будзе выклікаць прамую асацыяцыю мільёнаў людзей па ўсім свеце з нашай краінай, а таксама тым фактарам, які аб'ядноўвае вакол сябе ўсіх гасцей і натхніць удзельнікаў на яркія перамогі.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

Як і ва ўсіх талісманаў, у Лесіка ёсць свая легенда, яна звязана з казкай пра «Маленькага прынца». Пасля таго, як маленькі прынц пакінуў планету Зямля, лісяня засумавала. Усе думкі яго былі пра тое, як знайсці сяброў. Яно прынюхвалася і прыслухоўвалася, ад гэтага яго вушкі сталі большыя. Яно даследавала наваколле ў пошуках адказу на пытанне «Як жа зрабіць так, каб у яго з'явіліся сябры?». І аднойчы, дзякуючы сваім вялікім вушкам і моцным лапкам, яно даведалася, што недзе ў Беларусі існуе кветка, якая выконвае ўсе жаданні. Гэта легендарная беларуская Папараць-кветка. Лісяня адправілася ў Беларусь, каб знайсці Папараць-кветку і выканаць сваю мару. Шлях у яго быў нялёгкі, яму давялося зрабіць мільён крокаў, у гэтым мы можам пераканацца, убачыўшы яго фітнес-бранзалет.

Пра тое, што 2019-ы будзе самым яркім годам у яго жыцці, ды і ў спартыўным жыцці Еўропы, гаворыць надпіс на казырку Лесіка. Зялёны колер на футболцы талісмана азначае развіццё і гармонію, а чорныя шорты — дысцыпліну і рашучасць. Жоўтая шэрстка кажа аб яго жыццярадаснасці, сінія чаравікі сведчаць аб нязломнасці персанажа, а чырвоны колер адлюстроўвае яго энергічнасць.

Нагадаем: каб выбраць талісман II Еўрапейскіх гульняў, у краіне быў зладжаны конкурс. Самымі актыўнымі ў ім аказаліся мінчане, яны даслалі каля 500 работ. Таксама варыянты талісмана прыходзілі з-за мяжы, прытым не толькі ад суседзяў. Напрыклад, у конкурсе прыняў удзел жыхар Егіпта.

Адзначым, што ўдзел у прэзентацыі талісмана прынялі зорныя паслы II Еўрапейскіх гульняў доктар Рашэд Мустафа Сарвар, алімпійскі чэмпіён па веславанні на каноэ Аляксандр Багдановіч, прадстаўнікі замежных дыпламатычных місій, міністэрстваў і ведамстваў, знакамітыя спартсмены, прадстаўнікі шоу-бізнесу і партнёры гульняў, выхаванцы дзіцячых SOS-вёсак і кандыдаты ў валанцёры.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ВМС Украіны растлумачылі рашэнне накіраваць катары ў Керчанскі праліў

Камандуючы Ваенна-марскімі сіламі Украіны Ігар Воронченка заявіў, што баявыя катары былі накіраваныя ў Керчанскі праліў з мэтай паказаць, на што яны здольныя.

Ён сказаў, што рашэнне камандавання аб адпраўцы трох караблёў у Азоўскае мора, якія пры пераходзе парушылі мяжу РФ і былі затрыманыя расійскімі пагранічнікамі, не было памылковым.

«Па-першае, ужо быў праход караблёў забеспячэння праз Керчанскі праліў. Тут тое ж самае, — лічыць ён. — Група катараў ішла з буксірам — суднам забеспячэння. А, па-другое, мы павінны былі паказаць свой твар у Керчанскім праліве і Азоўскім моры, паказаць, на што здольныя гэтыя катары».

Адказваючы на пытанні журналістаў, кіраўнік ВМС Украіны заявіў, што не лічыць гэтыя катары, якія былі самымі сучаснымі ў складзе ВМС Украіны, страчанымі. «Украіна не страціла свае караблі, яны будуць вызваленыя», — паабяцаў ён.

### Паліцыя ФРГ правяла вобыск у штаб-кватэры Deutsche Bank па справе аб адмыванні сродкаў

Паліцыя ФРГ правяла ў чацвер вобыск у штаб-кватэры германскага Deutsche Bank у Франкфурце-на-Майне па справе аб адмыванні сродкаў. Пра гэта паведаміў тэлеканал N-TV.

Па яго звестках, следчыя займаюцца пошукам доказаў ажыццяўлення нелегальных транзакцый. У пракуратуры Франкфурта-на-Майне пацвердзілі, што вобыскі праводзяцца ў сувязі з падазрэннем у адмыванні сродкаў. Каментарыяў ад самога банка пакуль няма.

### Зурабішвілі перамагла на выбарах прэзідэнта Грузіі



Саламэ Зурабішвілі перамагла ў другім туры выбараў прэзідэнта Грузіі, набраўшы 59,52 % галасоў, у Грыгола Вашадзэ — 40,48 %. Пра гэта паведаміла ў чацвер ЦВК краіны.

Па яе звестках, пасля падліку галасоў на ўсіх 3705 выбарчых участках за Зурабішвілі прагаласавалі 1 млн 147 тыс. 627 выбаршчыкаў, што складае 59,52 % галасоў, за Вашадзэ — 780 тыс. 633, гэта 40,48 % галасоў.

У сераду ў Грузіі прайшоў другі тур выбараў, у якім удзельнічалі незалежны кандыдат у прэзідэнты Саламэ Зурабішвілі, падтрыманая кіруючай партыяй «Грузінская мара», і кандыдат у прэзідэнты ад апазіцыйнай партыі «Адзіны нацыянальны рух» (АНР — партыя прыхільнікаў экс-прэзідэнта Міхаіла Саакашвілі) і 10 саюзных з АНР арганізацый Грыгол Вашадзэ. Па звестках ЦВК, выніковая яўка на выбарах склала 56,23 % агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Раней Зурабішвілі заявіла журналістам, што для яе «будзе вельмі вялікай адказнасцю займаць пасаду прэзідэнта Грузіі», адзначыўшы, што «чакала сваёй перамогі на выбарах і верыла ў падтрымку выбаршчыкаў».

Спадчына ў законе

# Будслаўскі фэст — каштоўнасць чалавецтва!

**Будслаўскі фэст, любімы многімі жыхарамі нашай краіны, атрымаў міжнароднае прызнанне! Ён унесены ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва. Такое рашэнне днямі прыняў міждзяржаўны камітэт па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Падчас 13-й сесіі камітэта, якая адбывалася на Маўрыкіі, рашэнне аб уключэнні Будслаўскага фэсту ў лік каштоўнасцяў было прынята аднагалосна.**

**У наш час Будслаўскі фэст — гэта дзясяткі тысяч людзей розных канфесій, якія крочаць у бок адной з галоўных каталіцкіх святыняў. Яны выпраўляюцца з розных гарадоў і мястэчак Беларусі, каб у выніку злучыцца і стварыць агульнае ўрачыстае шэсце. Пілігрымы спыняюцца на начоўкі ў розных населеных пунктах, дзе адпачываюць, спяваюць песні, гутараць з мясцовымі жыхарамі, каб зранку працягнуць свой шлях з думкамі пра Бога.**

Чаму ж менавіта Будслаў абралі пілігрымы? Будынак храма складаецца з дзвюх частак: старога касцёла (сёння гэта капліца), пабудаванага ў 1633—1643 гадах, і новага, узведзенага ў 1767—1783 гадах. Такім ён дайшоў і да нашага часу. У старым касцёле знаходзіцца арыгінальны разьбяны драўляны алтар эпохі ранняга барока. Кампазіцыя алтара, як сведчаць даследчыкі, не мае аналагаў у сакральнай архітэктуры Літвы і Польшчы. На сценах касцёла да нашых дзён захаваліся ўнікальныя роспісы — восем сюжэтаў, якія з'яўляюцца выдатнымі помнікамі ранняга класіцызму.

Сам комплекс былога кляштара бернардзінцаў, а таксама дэкаратыўнае аздабленне касцёла — галоўны і бакавыя алтары, роспісы — унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як помнік першай катэгорыі. У 1994 годзе Будслаўскаму касцёлу нададзены тытул базілікі малой. Такім званнем храмы звычайна ўзвялічваюцца з-за свайго ўзросту, памеру ці гістарычнага значэння. Вернікі мараць, што калі-небудзь касцёлу будзе нададзена званне базілікі вялікай. Але такі статус надае толькі асабіста Папа Рымскі, прызнаючы тым самым значнасць храма. Тым больш прыемна, што цяпер фэст прызнаны нематэрыяльнай культурнай каштоўнасцю, да таго ж сусветнага ўзроўню!

Варта дадаць, што ўключэнне беларускай урачыстасці ў спіс ЮНЕСКА з'явілася вынікам шматгадовай сумеснай работы Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, Міністэрства культуры і Міністэрства замежных спраў нашай краіны пры шырокім удзеле мясцовых органаў улады і грамадскіх супольнасцяў, няўрадавых арганізацый і экспертаў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

На дарозе

## Бензавоз без «галавы»

**У выніку сутыкнення ЗІЛа і Scania ў Слуцкім раёне ў бензавоза адарвала кабіну разам з кіроўцам, а фура вылецела ў кювет.**

ДТЗ адбылося на аўтадарозе Р43 каля населенага пункта Іванаўскія Агароднікі. Кіроўца ЗІЛа, 1984 года нараджэння, ехаў у напрамку Слуцка. Спрабуючы здзейсніць абгон, ён выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з вялікагрузам Scania. За рулём фуры знаходзіўся мужчына 1971 года нараджэння. Абодва кіроўцы атрымалі траўмы, удары і былі шпіталізаваныя. Мужчыны былі цвярозыя. Абставіны ДТЗ устанаўліваюцца.

ДАІ нагадвае пра важнасць выканання правілаў абгону, прытрымлівання дыстанцыі, правільнай хуткасці руху, асабліва ва ўмовах галалёду і пры недастатковай бачнасці.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**



# ДАСТУПНАЯ МЕДЫЦЫНА

**У Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі адбылося ўрачыстае адкрыццё новага корпуса магнітна-рэзанансный тамаграфіі.**

У трохпавярховай прыбудове да лячэбна-дыягнастычнага корпуса бальніцы, дзе ўстаноўлены сучасны апарат МРТ, размясціліся таксама адміністрацыя, бухгалтэрыя і іншыя службы. На будаўніцтва аб'екта было выдаткавана каля 2 мільёнаў рублёў. Набыццё 18-тоннага тамографа абышлося Міністэрству аховы здароўя ў 540 тысяч еўра. Гэты апарат больш дасканалы і дазваляе з найбольшай дакладнасцю вызначыць захворванні на ранніх стадыях іх развіцця.

— Магнітна-рэзанансная і камп'ютарная тамаграфія — гэта тое, на што робіцца стаўка ў дыягностыцы дзеля своечасовага аказання медыцынскай дапамогі. У краіне прыняты курс на сціранне межаў паміж рэгіянальнымі, міжабласнымі, міжраённымі медустановамі і стварэнне рэгіянальных медыцынскіх цэнтраў. Чалавек павінен атрымаць дапамогу па месцы свайго жыхарства, — падкрэсліў у сваёй прамове падчас адкрыцця **міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА.**

**Губернатар вобласці Уладзімір ДАМАНЕЎСКі** адзначыў, што ў краіне шмат чаго робіцца для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя. Летась у Магілёве былі ўведзены ў строй хірургічны корпус і цыталагічная лабараторыя ў абласным анкадыспансеры, а таксама лабараторыя даследаванняў харчовых прадуктаў на базе абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.






Фота БелТА.

Адкрыццё новага корпуса гарадской бальніцы таксама не канчатковы этап у рэканструкцыі ўстановы. На чарзе — завяршэнне капітальнага рамонту радзільнага дома, мадэрнізацыя іншых карпусоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Надвор'е

# СНЕЖАНЬ, ХАЛОДНЫ І СЫРЫ

## АЛЕ НОВЫ ГОД БЕЛАРУСЫ СУСТРЭНУЦЬ СА СНЕГАМ

**З кожным годам зіма ў нашай краіне прыходзіць усё пазней і пазней. Згодна з народным павер'ем, снежнае покрыва стабільна ўтворыцца ўжо праз 40 дзён пасля таго, як выпадзе першы снег. Апошнім часам ён выпадае ў сярэдзіне і канцы снежня.**

### Трохі халадней

Па словах сіноптыкаў, нягледзячы на кліматычныя асаблівасці планеты, якія змяняюцца з цягам часу, будучая зіма ў Беларусі можа аказацца больш суровай, чым год назад. Першыя яе праявы далі сябе адчуць яшчэ ў сярэдзіне лістапада. Прычына — уздзеянне арктычных мас і зніжэнне сонечнай актыўнасці.

А таму можна з упэўненасцю сказаць, што літаральна з першых дзён зімы ў краіне ўсталюецца марознае надвор'е. Вядома, зрабіць больш дакладны прагноз зараз проста немагчыма, з-за пераменнасці нашага клімату — заўсёды ёсць верагоднасць таго, што ў апошні момант надвор'е прынясе нейкі нечаканы сюрпрыз. Напрыклад, на партале Gismeteo з 4 да 6 снежня нас чакае істотнае пацяпленне, калі нават уначы абяцаюць плюсавую тэмпературу.

Першы месяц зімы сёлета будзе ўмерана марозны, сярэдняя ж тэмпература паветра не абяцае панізіцца ніжэй за мінус 15 — мінус 18 градусаў па Цэльсіі. Асноўныя маразы ў снежні прыйдуцца на сярэдзіну месяца, калі з 14 да 17 снежня спецыялісты прадказваюць умераныя (да мінус 17 градусаў) маразы. У першую палову месяца вялікай колькасці ападкаў не прадбачыцца. Бліжэй да новага года павінна зноў злёгку пацяплець, а колькасць ападкаў павялічыцца, галоўным чынам у выглядзе мокрага снегу.

### Не заўсёды ў норме

Тэмпературная норма снежня складае мінус 3,3 градуса. Але апошнім часам першы месяц зімы быў значна цяплейшы (ад мінус 1 да мінус 2 градусаў). У снежні ў краіне выпадае 45 мм ападкаў. Снегапады чаргуюцца з лёгкімі дажджамі. У месяц фіксуецца два дажджлівыя і два сонечныя дні. Снег увогуле ідзе 13 дзён.

Вільготнасць вельмі высокая — 90 %. Таксама зімой воблачна: максімальная колькасць пахмурных дзён прыпадае на перыяд з лістапада да студзеня (80—85 %). Мінск, такім чынам, атрымлівае ўсяго 1,7 сонечнай гадзіны ў суткі. Мінімальныя паказчыкі ў светлавога дня: у першы зімовы месяц ён доўжыцца 7,5 гадзіны.

### Прыкметы ў дапамогу

Вядома ж, расказаць з упэўненасцю, якое менавіта акажацца надвор'е праз такі працяглы прамежак часу практычна немагчыма, а таму даводзіцца звяртацца па дапамогу да мінулых гадоў. Па словах сіноптыкаў, не трэба чакаць ад халоднай пары года нечаканых сюрпрызаў — надвор'е будзе стабільным для рэгіёна: умераная колькасць ападкаў, адсутнасць моцных замаразкаў і рэзкіх адліг. Зразумела, што першае сур'ёзнае пахаладанне наступіць пасля сырога і золкага лістапада. Снегу ў гэты перыяд практычна не будзе, а той, што ўсё ж такі выпадзе, адразу ж растане. Фактычна будучая зіма на тэрыторыі краіны наступіць у момант свайго каляндарнага старту.

Праверыць дакладнасць звестак аб тым, якой менавіта абяцае быць будучая зіма, можна з дапамогай няхітрага спосабу — выкарыстоўваць прыкметы нашых продкаў:

«Калі ўзімку пачынаецца навальніца, будуць лютыя маразы, а калі яшчэ і суправаджаецца маланкамі, то не пазбегнуць страшнай буры. Тым больш жалуду ў лесе, тым даўжэй будуць цягнуцца халады. Калі першы снег лёг на яшчэ не абсыпанае з дрэў лісце, зіма будзе суровая. Калі кастрычнік выдаўся цёплы, такую прадвяшчаюць і зіму. Калі раніцай хорам спяваюць сініцы, уначы будзе мароз. Ранкам на кустах і дрэвах пухнаты іней — дзень будзе сонечны і цёплы».

### Свята са снегам

Прымаючы пад увагу доўгатэрміновы прагноз надвор'я, мы чакаем у канцы снежня тэмпературу паветра, якая будзе трымацца на некалькі градусаў ніжэй за нуль. Згодна з папярэднім прагнозам надвор'я на месяц, апублікаваным на партале Gismeteo, Новы год беларусы сустрэнуць са снегам. Праўда, у Брэсцкай вобласці хутчэй за ўсё — з мокрым. Калі ў Мінску ў ноч на 31 снежня абяцаюць ад мінус 3 да мінус 5 градусаў, то сярэднясутачная тэмпература ў Брэсце складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

### На 3—7 градусаў ніжэй за норму

Кароткачасовы снег, галалёдзіца і да 16 марозу чакаецца ў нашай краіне на выхадныя, паведамілі **спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А ўсяму віной скандынаўскі антыцыклон, які прынёс да нас анамальныя халады. Сёння тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца на заходняй перыферыі халоднага антыцыклону. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Без ападкаў. На асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні, умераны, па захадзе краіны парывісты. Максімальная тэмпература паветра ў сярэдзіне дня ад мінус 2 да мінус 8 градусаў. Атмасферны ціск будзе падаць.

Антыцыклон сыходзіць на Паволжа, і ў наступныя выхадныя дні тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам франтальнага раздзелу, які змяшчаецца з Украіны. У суботу ўначы па паўднёвым усходзе, удзень у асноўным у цэнтральных і ўсходніх раёнах краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў асноўным складзе ад мінус 7 да мінус 14 градусаў, пры праясненнях панізіцца да 16 марозу. Удзень будзе 3—9 градусаў ніжэй за нуль.

У нядзелю пераважна па ўсходняй частцы краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—11 марозу, па захадзе пры праясненнях — да мінус 13 градусаў. Удзень будзе ад нуля да мінус 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, на наступным тыдні надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплая паветраная маса атлантычнага паходжання. Пацяплее, а ападкі будуць выпадаць у выглядзе мокрага снегу і дажджу. У панядзелак уначы ў асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег. Раніцай і днём пераважна па заходняй частцы краіны пройдуць ападкі (мокры снег, дождж), месцамі магчымы туман і галалёд. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 марозу, па ўсходзе пры праясненнях — мінус 9—12 градусаў. Удзень будзе ад плюс 3 градусаў па захадзе да мінус 6 градусаў па ўсходзе краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ВОСЕНЬ ЖЫЦЦЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І гэты невялічкі калектыў з 14 чалавек робіць сваю работу як след. Пра апошняе сведчаць знешні выгляд старых, спакойная атмасфера, адсутнасць спецыфічнага паху ў палатах, дзе большасць людзей ляжачыя. Галіна Палішчук сваім калектывам ганарыцца. Многія з санітарак і сясцёр ужо на пенсіі, адпрацаваўшы столькі гадоў медыкамі, не растрацілі спагаду да людзей. Іх не трэба кожны раз кантраляваць.

Бо тут спецыфічныя ўмовы. Старых патрэбна дагледзець, часам як малых дзяцей. Вось заступае Ганна Міхайлаўна Хвашчова на начную змену, яна спачатку ўсе неабходныя маніпуляцыі зробіць, а потым пацыентам ногі папарыць, ногці паабстрыгае. Для кожнага добрае слова знойдзе. У іншых супрацоўнікаў свае падыходы. Тут нярэдка бывае, калі адзінокім, тым, каму зусім не прыносяць перадач, часам кладуць у халадзільнік нешта дамашняе, маўляў, і вам перадалі, калі вы спалі.



Санітарка Ларыса ГЕРАСІМУК і пацыентка Марыя СЕРАДА.

## АДЗІНОКІЯ

Найбольш насельнікаў гэтай бальніцы людзі адзінокія, тыя, у каго няма дзяцей. Такія, напрыклад, як Марыя Фёдараўна Серада з Замшан. Яна трапіла сюды разам з братам. Абое адзінокія, сем'ю не стварылі. Брат і памёр у гэтай бальніцы літаральна на руках у сястры. А Марыя Фёдараўна без нагі, гады два таму ёй зрабілі аперацыю. Яна стараецца рухацца, каб не ляжаць зусім. Ахвотна ўступае ў размову, радуецца кожнай магчымасці з кімсьці пагаварыць. Побач на тумбачцы ляжыць раённая газета, бабулька цікавіцца мясцовымі навінамі. Жанчына расказвае пра свае беды, незайздросны лёс, але разважае нібы коласаўская старожка з рамана «На ростанях»: «Жыве чалавек, бо жывы ў зямлю не палезеш».

Санітарка Ларыса Герасімук, якая прыйшла дапамагчы апрануцца Марыі Фёдараўне, адзначыла потым, што гэтая пацыентка адна з самых адэкватных. Многія, на жаль, не ўсведамляюць рэальнасці, некаторыя нават не ведаюць, дзе яны знаходзяцца.

## САЛАМЯНЫЯ ЎДОВЫ І ЎДАЎЦЫ

Галіна Іванаўна зазначае, што ўжо некалькі чалавек прайшло праз іх бальніцу з падобнымі жыццёвымі гісторыямі. Пачыналася прыкладна аднолькава. Жыў у вёсцы амаль што прыгажун, вясёлы і зухаваты мужчына, на працы не апошні, жанчын любіў. І ў нейкі момант сышоў з сям'і да другой, там жыў на правах прымака, без усялякіх фармальнасцяў. Ну і жыў, здавалася б, нядрэнна, пакуль працаваў па гаспадарцы, зарплату прыносіў. Усё было добра і задавальняла абодва бакі. А потым гэта грамадзянская жонка памірае, і яе дзеці даюць у лепшым выпадку некалькі дзён на зборы і ад'езд. А калі ехаць няма куды і здароўе не надта, падобная бальніца можа быць выйсцем. Ёсць яшчэ адзін варыянт развіцця падзей, нават больш радыкальны. Калі чалавек пачынае хварэць, яго грамадзянская жонка проста выганяе з хаты. Адзін з такіх небарак і пражывае зараз у названай бальніцы.



Галіна ПАЛІШЧУК.

Прыгадалася даўняя сустрэча з жанчынай — кіраўніком аднаго вясковага прадпрыемства з пераважна мужчынскім калектывам. Яна са смехам расказвала, што на ўсіх святочных нефармальных мерапрыемствах яна не прамінае даць такі напаўжартоўны наказ: «Не бегайце за маладымі жанчынамі, пільнуйцеся жонак! Тыя, што бегаюць, здараецца, пад плотам шлях заканчваюць». У гэтым жарце, згадзіцеся, ёсць доля праўды.

## БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Яшчэ больш шкада тых пацыентаў бальніцы, у якіх ёсць дзеці. Зараз не кажу пра такіх дзяцей, якія самі вядуць асацыяльны лад жыцця і не могуць быць апорай на старасці гадоў. Ёсць пэўная частка людзей, якія па аб'ектыўных прычынах не могуць дагледзець старых бацькоў. Напрыклад, самі яшчэ не на пенсіі, а старога чалавека нельга пакінуць аднаго ў кватэры, бо ў яго дэменцыя, ён можа ўключыць газ альбо выйсці ў акно ці балконныя дзверы. Часам дзеці кажуць: «Будзем аддаваць пенсію і яшчэ столькі ж плаціць, толькі дагледзіце бацьку ці маці ва ўстанове».

І яшчэ адну катэгорыю людзей бачылі ў сваіх сценах работнікі гэтай бальніцы. У іх выпадку было, што жонка хоча дагледзець сваю маці дома, а муж — катэгарычна супраць. І пытанне стаіць рубам: альбо цешча ў кватэры, альбо развод. Бывае, вядома, і наадварот, жонка на парог не пускае старую і хворую свякроў.

Тут можна хіба маладым параіць, каб прыглядаліся адно да аднаго яшчэ да вяселля. Вось вам тэст на спагаду: замест наведвання забаўляльнай установы запрасіце кандыдата ў сужэнцы ў бальніцу сястрынскага догляду з фруктамі і салодкімі падарункамі. Па яго рэакцыі на гаротную старасць можна многае зразумець. З'явіцца нагода пагаварыць на гэтую тэму.

І другая выснова, што падобныя ўстановы трэба развіваць. Асабліва для тых, хто можа заплаціць, павінны быць дамы састарэлых больш высокага ўзроўню, чым цяперашнія бальніцы сястрынскага догляду, такія, куды б пажылыя людзі не баяліся трапіць.

## ВАЛАНЦЁРЫ І МЕЦЭНАТЫ

Аўтара гэтых радкоў запрасіла ў Вялікарыцкую бальніцу старшыня Маларыцкай раённай арганізацыі Беларускага фонду міру Людміла Бурштын. Людміла Віктараўна разам са сваімі актывістамі часам бываюць у гэтай установе. Яны прывозілі сюды коўдры, пасцельную бялізну, іншыя падарункі. Прыязджаюць і на святы, каб падтрымаць пацыентаў бальніцы, даць зразумець сталым людзям, што пра іх не забылася грамадства, іх помняць. Зараз Людміла Віктараўна сумесна з абласным кіраўніцтвам аддзялення Фонду міру актыўна займаюцца пошукамі спецыяльнага прыстасавання для купання ляжачых людзей. Спадзяюцца, што за месяц-другі ўдасца набыць патрэбную рэч. Цяпер жа работніцы бальніцы часам учатырох нясуць хворага ў ванну. Самі немаладыя, спіны баляць. Для іх такое крэсла было б як знаходка.

Нельга сказаць, што ў бальніцу ніхто не прыходзіць. І святар мясцовы зазірае, і старэйшыя школьнікі, як ужо гаварылася, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый з раёна. Але такія візіты выглядаюць як разавыя акцыі. А так, каб былі пастаянныя наведвальнікі, у нас нібы і не прынята. У Вялікай Рыце, немалым населеным пункце, і суседніх вёсках шмат, напрыклад, пенсіянераў актыўнага ўзросту, ёсць пярвічкі асобных грамадскіх арганізацый. Але да сельскай мясцовасці павевы валанцёрскага руху даходзяць марудна. І дарма. Ніхто ні ад чаго не застрахаваны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Маларыцкі раён.*

# ДА РОЎНЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён таксама адзначыў, што сярод дапамог для сем'яў з дзецьмі немалую частку складаюць выплаты сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. «Акрамя таго, летась была дадзена магчымасць працаваць на паўстаўкі бацькам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда», — дадаў намеснік міністра. Дарэчы, з 31,7 тысячы дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў толькі 650 знаходзяцца ў інтэрнатных установах. Пераважная большасць, паводле слоў Аляксандра Румака, выхоўваецца ў сем'ях, у хатніх умовах.

Многія, атрымаўшы інваліднасць, тым не менш хочуць працягваць працаваць, імкнуцца рэалізаваць свой патэнцыял — крыху больш за 86 тысяч людзей з інваліднасцю працуюць. Па словах намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны, у Беларусі створана адпаведная заканадаўчая база, якая вызначае палітыку занятасці для гэтай катэгорыі.

Так, для людзей з інваліднасцю пры прыёме на работу не ўстанаўліваецца выпрабавальны тэрмін, у іх ёсць магчымасць прайсці перанавучанне, атрымаць новую прафесію. Наймальнікам кампенсуюцца выдаткі на абсталяванне рабочых месцаў для інвалідаў. Таксама любы чалавек з асаблівасцямі развіцця пры жаданні можа атрымаць субсідыю на арганізацыю сваёй справы.

«Цяпер няма такога паняцця, як рабочая або нерабочая група інваліднасці, — заявіў дырэктар РНПЦ медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі Васіль СМЫЧАК. — Чалавек з любой групай можа працаваць пры жаданні і адсутнасці супрацьпаказанняў да таго або іншага роду дзейнасці».

— Калі раней па выніках абследавання вызначалася, кім можа працаваць чалавек з інваліднасцю, што ўскладняла выбар прафесій, то цяпер мы пайшлі на тое, каб праграма выяўляла, якая праца проціпаказаная чалавеку з улікам яго захворвання, — растлумачыў Аляксандр Румак.

> **«Цяпер няма такога паняцця, як рабочая або нерабочая група інваліднасці. Чалавек з любой групай можа працаваць».**

У першым квартале наступнага года будзе створана новая індывідуальная праграма рэабілітацыі інваліда — цяперашнія працуюць недастаткова добра. «Ёсць даручэнне распрацаваць новую індывідуальную праграму рэабілітацыі, узгадніць яе з усімі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі, а таксама грамадскімі аб'яднаннямі інвалідаў. Акрамя таго, упершыню ў Беларусі будзе прынятая і ўкаранёная індывідуальная праграма рэабілітацыі і абілітацыі дзіцяці-інваліда. Сёння асобнай такой праграмы ў нас няма», — сказаў Васіль Смычак.

**Святлана БУСЬКО.**

Добрая навіна

# ДРУЖНЫЯ І ПАЗІТЫЎНЫЯ

**Беларусы занялі 2-е месца ў агульным заліку Парадэльфійскіх гульняў — 2018 і заваявалі Гран-пры ў намінацыі «Вакальнае мастацтва»**

Нядаўна ў расійскім Іжэўску (Удмурція) завяршыліся Другія міжнародныя Парадэльфійскія гульні — маштабныя інклюзіўныя творчыя спаборніцтвы для людзей з інваліднасцю, якія прадстаўлялі 22 краіны свету. Вельмі ўдалым быў удзел у мерапрыемстве беларускай дэлегацыі: як расказала **Наталля ЗАДЗЯРКОЎСКАЯ, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры,** пры непасрэдным фінансавай падтрымцы якога ажыццяўлялася гэта паездка, у неафіцыйным «медальным заліку» наша краіна заняла 2-е месца па колькасці атрыманых узнагарод, саступіўшы толькі Кітаю.

Цягам тыдня больш як 1,5 тысячы ўдзельнікаў выступалі ў 29 намінацыях па 8 відах мастацтва: музычнае, выяўленчае, аўдыявізуальнае, тэатральнае, харэаграфічнае, цыркавое, літаратура і жэставая песня. Таксама ў межах Гульняў праходзілі тэматычныя міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі, адбываліся шматлікія семінары, творчыя сустрэчы і майстар-класы (напрыклад, беларускі параалімпіец, бізнесмен, майстар спорту і ўдзельнік нацыянальнай параалімпійскай каманды па плаванні Аляксей Талай шмат сустракаўся са школьнікамі і студэнтамі, зараджаў аптымізмам і жыццялюбствам асаблівых выхаванцаў цэнтра сацыяльнага прадзюсіравання «Журавейнік»).

Народны мужчынскі вакальны гурт «Хорус», які вось ужо 13 гадоў дзейнічае на прадпрыемстве «Элект» Беларускага таварыства інвалідаў па зроку, прадставіў на Другіх Парадэльфійскіх гульнях вакальнае мастацтва. Квартэт выконваў два музычныя нумары: «Белая Русь ты мая» і папуры, складзенае з песень савецкіх кампазітараў. І, нягледзячы на сур'ёзную канкурэнцыю — больш як 100 удзельнікаў — атрымаў Гран-пры! «Гэта безумоўна важны і важкі вынік, — адзначае кіраўнік калектыву Ігар Кецкін, — бо ў сваёй сістэме Беларускага таварыства інвалідаў па зроку мы шмат разоў займалі першыя месцы на розных конкурсах, але прызнанне на міжнародным узроўні, выступленне на адной сцэне з такімі артыстамі, як «Буранаўскія бабулі», Дыяна Гурцкая — гэта была новая прыступка. Без лішняй сціпласці скажу, што ўся Удмурція за гэтыя дні закахалася ў маіх хлопцаў».

Акрамя таго, арганізатары Гульняў назвалі беларусаў «Самай пазітыўнай і дружнай камандай удзельнікаў».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




## НЕ ПЛАЧ, ЗГУБІЎШЫ

...Вечар, ціш — і за акном, і ў душы. Тэлефонны званок неспадзеўкі:

— Ура, ён знайшоўся! — хваліцца мая сястра.

— Хто знайшоўся? — не разумею я.

— Не хто, а што...

Амаль год таму ўвечары, управіўшы гаспадарку, сястра села вязаць шкарпэткі. Іх — з дамашняй воўны, з прыгожым арнаментам — любіць уся радня... Толькі вяжы.

Дык вось, скончыла яна працу над чарговай парай, узяла вялікую іголку, каб вочкі сабраць, як чуе — сабака ўсхадзіўся: брэша, аж заліваецца.

Яна зірк у акно: па вуліцы цэлая працэсія ідзе — з участковым наперадзе, у двор яе збочвае... «З чаго б гэта?» — думае сястра і ўспамінае, што надоечы ў аўтакраме бутэльку гарэлкі брала. Можа, самапальная? Трэба было б схаваць... Але куды? Добра, зяць гадоў колькі таму металічную скрыначку ёй прывёз, так званы сейф — для дакументаў, для грошай...

Яна ключыкам павярнула, пляшку ўнутр паставіла, дзверцы замкнула, а сама — да людзей.

Тыя — у хату, праверылі стан печы, дымаходаў, пажарнага апавяшчальніка, пакінулі свае заўвагі ды пайшлі.

Гаспадыня, трохі панерваваўшыся, хацела ў сейфе таблетку ўзяць, а ключа... нямашака: не помніць, куды палажыла, і ўсё тут!

Праз дзень дачушка прыехала, каб печку пабяліць. Маці хацела папрасіць, каб яна страхоўку заплаціла, каб купіла батарэйку да апавяшчальніка... Але ж грошы ў сейфе, а ключа няма.

З гора тэлефануе зяцю (мужу іншай дачкі): падкажы, маўляў, ці можна сейф «узламаць» — адчыніць без ключа?

— А Таня на чым прыехала? — пытаннем на пытанне адказвае той. — Калі на машыне, то хай зірне ў бардачок: там яшчэ адзін ключ ляжыць.

«Малайчына, абачлівы зяць!» — падумала пра чалавека цешча: амаль цэлы год яна адчыняла і зачыняла сейф ягоным ключом.

...А потым зноў наступіла восень, пахаладала — нашчадкі прыехалі да сястры, каб вокны падвойныя ўставіць, дапамагчы па гаспадарцы.

— Мама, а лішніх цёплых шкарпэтак у цябе няма? — спытала дачка. — А то на працы так холадна!

Замітусілася жанчына, кінулася да шафы. На адной з паліц адшукала новыя шкарпэткі, з якіх выпаў... ключ ад сейфа, прычым разам з іголкай. Яна таксама тады «прапала»...

— Праўду кажуць: не плач, згубіўшы, — па тэлефоне павучала мяне сястра. — Глядзіш, усё і знойдзецца. Хоць праз год.

**Лілія Скіндзер,**

*г. Івацэвічы.*

## ДВАЦЦАЦЬ СМС-АК

Цікавыя цяпер дзеці: асобным яшчэ цяжка размаўляць, а вось гаджэтам карыстацца — ды што раз плюнуць.

Не буду разважаць, добра тое ці не... Галоўнае, каб у меру і на карысць.

Якраз пра яе і размова.

Нехк у майго саслужыўца дзень нараджэння быў. Я ведаў яго занятасць, а таму не стаў турбаваць візітам ці тэлефонным званком: прыдумаў віншаванне з пажаданнем здароўя, кар'ернага росту і на пагоны — вялікіх зорак, ды стаў набіраць СМС-ку. Часу на гэта мне патрабавалася шмат, бо ў дадатак да ўсяго побач круцілася мая трохгадовая дачушка і раз-пораз адцягвала ўвагу.

Але ж вось нарэшце я набраў віншаванне, засталося хіба перачытаць яго ды націснуць кнопку «адправіць»... Зрабіць гэта я не паспеў — дзіця папрасіла есці.

Прыйшлося адхінуцца — і толькі на хвіліну, здаецца, але ж гэтага было дастаткова, каб дачка, ухапіўшы мабільнік, адправіла віншаванне... дваццаці адрасатам.

Што за тым пачалося?

Праз пару мінут, як і трэба было чакаць, патэлефанаваў першы «імяніннік». Ён падзякаваў за віншаванне і ўдакладніў, што да яго дня нараджэння яшчэ чатыры месяцы... Затым быў званок ад другога, трэцяга, ад жанчын, якія пыталіся, прычым тут пагоны і вялікія зоркі?..

Карацей, тэлефон не сціхаў мо гадзіны са дзве, пакуль не адзваніўся кожны з павіншаваных.

З усімі я паразмаўляў, з усімі пажартаваў і адчуў (прычым узаемна!), як жа не хапае нам простых чалавечых зносін і душэўных размоў!

...З той пары ўсіх сваіх родных і знаёмых віншую толькі асабіста. А калі і шлю СМС-кі, то хіба наўздагон — у якасці дадатку. Дзіця навучыла.

**Генадзь Мішчук,**

*в. Вотчына,*
*Маларыцкі раён.*

**P. S.** У майго найстарэйшага сябра, настаўніка і паэта Мікалая Пацеюка (якому, дарэчы, 24 снежня спаўняецца 80, з чым і віншую...) ёсць прыгожыя радкі:

*Святочны дзень сакавіка*
*Прабіўся першаю пралескай,*
*І пацягнулася рука,*
*Каб скінуць маме... СМС-ку,*
*Хоць трэ было б узяць білет,*
*Каб у святле аконнай рамы*
*Убачыць родны сілуэт*
*І прытуліць да сэрца маму...*

## ГАСПАДАРЫ ДАРОГІ

У лясах нашай Бярэзіншчыны некалі вадзіліся ў асноўным дзікі ды ваўкі. Прычым апошнія былі настолькі смелыя, што зімой прыходзілі на падворкі і «рэзалі» там усё, што траплялася. Найбольш даставалася сабакам. Калі ў хаце быў мужчына, гаспадар, ён яшчэ мог заступіцца за свайго гадаванца — неяк адбіць. Калі ж не, — жыццё Тузіка ці Барсіка трагічна абрывалася.

А вось летам людзі жылі спакайней: у грыбы ды ягады хадзілі смела — нават жанчыны...

Але ж гэта — раней, іншая справа зараз, калі, апроч ваўкоў ды дзікоў, у лясах сталі гаспадарыць ласі, казулі, там жа можна сустрэць рысь ці нават мядзведзя.

...Мая знаёмая з вёскі Гарэнічы расказвала, як аднойчы на машыне ехала па лясной дарозе і ўбачыла наперадзе нешта вялізнае. Думала, карова, але чаму ў такую рань?.. Пад'ехала бліжэй — лось! І не з месца!

Яна па тармазах — спынілася за колькі метраў. А далей, што называецца, нямая сцэна: жанчына глядзіць на жывёліну, а яна — на яе, ды з такой пагардай: маўляў, што за кузурка тут?.. «Зараз, думаю, бампер рогам падчэпіць, і ўсё, кранты — і мне, і маёй машыне», — расказвала жанчына.

Аднак прыгажун не захацеў, паленаваўся, відаць, схіляць галаву — адвярнуўся да машыны задам...

«Ну, думаю, гэта яшчэ «лепш», — прыгадвала кабета. — Зараз капытамі як дасць, — аж дадому закіне... З кучай металалому».

Лось і сапраўды падбрыкнуў: капытамі ледзь фары не пабіў... А потым трушком пакіраваў у лес.

Ледзь ачомаўшыся ад страху, паехала далей і жанчына.

Па дарозе думала яшчэ, што чалавек — гэта і сапраўды гучыць, прычым горда: сам за рулём, у сваёй машыне, з музыкай ды мабільнікам ён, як быццам, гаспадар дарог.

Аж пакуль не сустрэне іншага...

**Ніна Бурко,**

*г. Беразіно.*

## ЗУХ СУПРАЦЬ МУХ...

Безліч анекдотаў пра людзей з Поўначы. І яны, гэтыя людзі, там заўсёды нейкія цёмныя, забітыя, бедныя... Іншыя — хіба зрэдку. Накшталт...

Машына ў сумётах засела. Кіроўца з ёй і так і гэтак, а выехаць — аніяк, хоць ты плач!..

Як паратунак — чукча на сабаках. «Я ведаю, — кажа, — што табе трэба. Выпіць нальеш, — скажу». Кіроўца, вядома ж, ад слова... «Трактар трэба», — выпіўшы, падказаў яму чукча і паехаў сабе далей. Можа, і па цягач...

Падобную ў нечым гісторыю я выпадкова пачуў у цягніку.

Гадоў з 30 таму ў адзін з мінскіх інстытутаў паступіла дзяўчына з Поўначы, стала вучыцца і сябраваць са сваім аднакурснікам, тутэйшым хлопцам. У выніку гэтага сяброўства яна, як часта бывае, зацяжарала, а сябар, замест таго, каб узаконіць адносіны, даўся «ў прочкі»: маўляў, чаму гэта я ды павінен жаніцца з нейкай там...

Тая, ну, вядома ж, у слёзы, у адчай. Дзяўчаты, з якімі жыла ў інтэрнаце, — у роспыты. Прыйшлося ўсё расказаць, а потым, па іх парадзе, пайсці ў камітэт камсамола.

І жаніха туды ж паклікалі. Сказалі: «Хлопча, ты дрэнна робіш. Альбо жаніся давай, альбо развітвайся — і з камсамолам, і з інстытутам»...

Хоць-нехаць ён выбраў першае.

І вось вяселле: тут і па нашых тутэйшых звычаях — дзяльба каравая. Першымі падыходзяць бацькі маладой, віншуюць дачушку, зяця, кладуць на паднос ашчадную кніжку.

— Так... І колькі ж яны падарылі? — гучна, бо на публіку, пытае тамада і разгортвае старонкі. — О-ого!? Тут напісана (аж закашляўся) дзве... тысячы рублёў?!

Госці з боку жаніха (іх, вядома ж, большасць) адразу ў рогат: маўляў, жартуй, брат, ды меру ведай! (Самі збіраліся рублёў па 25 дарыць... Найбліжэйшыя з радні — 50, ад сілы).

Тым часам на каравай запрашаецца дзядзька маладой.

І зноў, што называецца, смех у зале, бо ён таксама з ашчадней кніжкай. І на ёй — тысяча рублёў.

— Так-так, я не жартую, — папярэдзіў тамада. — Хто не верыць, — можа падысці пагл‌ядзець.

Перасмешнікі акруглілі вочы і сціхлі: правяраць ніхто не пайшоў.

...Не ведаю, як у тых маладых склалася жыццё. Мае спадарожнікі самі аб гэтым не казалі, а распытваць няёмка было. Але ж я тады яшчэ раз зрабіў высsnову, што нельга з пагардай ставіцца да іншых народаў, да іншых людзей. Яны, то-бок мы, усе розныя: у кожным чалавеку «намешана» ўсяго — і добрага, і дрэннага. Што ўжо казаць пра народы...

Той, хто не хоча гэтага заўважаць, хто спрабуе ўзвышацца, часта аказваецца прыніжаным. Як у прымаўцы: зух супраць мух, а супраць зуха і сам муха.

**Мікалай Старых,**

*г. Гомель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

---

Неасабісты суб'ектыў



# Памяць сэрца

### Пра тое, што не можа знішчыць полымя

Я к адчувала гэту бяду, калі перад сёлетнім вечарам сустрэчы напісала: «Пакуль на зямлі стаіць твая школа, да таго часу ты адчуваеш сябе вучнем»... Усё скончылася. Наша старая школа згарэла ў ноч з нядзелі на панядзелак. Пыхнула свечкай на высокай гары, адляцела з іскрамі да неба. Школы ў нас — ва ўсіх маіх землякоў, што атрымлівалі сярэднюю адукацыю ад пасля вайны да пачатку 90-х, цяпер няма. Мы — усе пакаленні: і зусім ужо старыя, і маладзейшыя — сталі ў тую лістападаўскую ноч абсалютна і назаўсёды дарослымі.

Здавалася б, усяго толькі стары будынак. І плакаць па ім няёмка — ёсць у жыцці значна большыя страты, не чалавек жа блізкі памёр. Чаму ж тады апошнія дні ўсе тэлефонныя размовы з людзьмі, якіх гэта навіна таксама асабіста датычыць — а гэта і сваякі, і аднакласнікі, і суседзі, — пранізаныя невыказаным жалем, чаму так цяжка ўздыхаем у трубку, чаму надоўга замаўкаем, бы стараючыся ўспомніць нешта вельмі важнае ці падабраць патрэбныя словы, а не атрымліваецца?

Можа, таму што кожнаму з нас часта сніцца дзяцінства — не нафантазіраванае, а тое, якое насамрэч было, і пацвярджэннем гэтай сапраўднасці якраз і паўстае заўсёды гэты драўляны будынак на высокай гары каля касцёла, пафарбаваны то ў строгі цёмна-зялёны, то ў легкадумны блакітны колер. Ты ідзеш або бяжыш па яго вузкіх цемнаватых і заўсёды прахалодных калідорах, зазіраеш у класы з пафарбаванымі ў серабрысты колер грубкамі, адчуваеш, як пахне ў кабінеце хіміі, а як — у бібліятэцы, прыцішваеш крокі каля настаўніцкай, употай з асцярогай зазіраеш у ваенны кабінет — там заўжды вучацца старшакласнікі. Або зімой на перапынку выбягаеш са школы на вуліцу і нясешся з крутой абледзянелай і раскоўзанай гары — на нагах, на санках, на прыхопленай з сабой кніжцы ў цыратовай вокладцы — уніз, да рэчкі на шалёнай хуткасці, і толькі сівер свішча ў вушах і апякае шчокі. Ці проста задыхаешся ў сне ад даўкага водару чаромхі, якую, нарваўшы на той жа гары цэлы ахапак, валачэш у клас проста праз расчыненае акно...

Школа наша, калі меркаваць па сучасных стандартах, была для навучання прыстасаваная вельмі ўмоўна. Яна была пабудаваная да вайны, яшчэ «за польскім часам» як дом для ксяндза (касцёл зусім побач). Пасля вайны касцёл перастаў быць храмам (былі ў ім то збожжасховішча, то спартзала, то клуб), а ксяндзоўскі дом аднойчы і на дзесяцігоддзі зрабіўся школай. Усе выгоды былі на вуліцы, майстэрня і сталовая — у асобных будынках. Ацяпленне было пячное, кацельня з парамы з'явілася ў 70-х. Месца не хапала (цяпер нават складана ўявіць, што ў вясковай школе на адной паралелі вучылася па некалькі класаў), займаліся ў дзве змены. Некаторыя класы былі прахадныя, геаграфічныя і гістарычныя карты захоўваліся ў шафе на калідоры. Але менавіта ў гэтай цеснаце і было нешта цёплае, утульнае, сямейнае. І з гэтай звычайнай вясковай школкі выпускнікі паступалі ў ВНУ, прычым у самыя прэстыжныя — і ў «наргас», і ў «ін'яз», і ў БДУ (і на матэматыку, і на фізіку, і на філалогію), — без ніякіх рэпетытараў. Можа, таму, што гэта сямейная атмасфера не дазваляла нікому халтурыць — ні вучням, ні настаўнікам?

У 1990-м мы перасяліліся ў новы будынак — з прасторнымі класамі, майстэрняй, спартыўнай залай і нават цірам у сутарэнні. Апошнія паўтара года давучваліся ўжо там — у ружовым цагляным будынку з белай акантоўкай, які стаіць у нізіне на ўскраіне вёскі і здалёк вока не прыцягвае, бо асабліва ніадкуль не відаць. Старая школа ў той постсавецкай неразбярысе некалькі разоў мяняла гаспадароў, але заставалася непарушна стаяць на высокай гары, нібы падміргваючы здалёк сваімі шматлікімі вокнамі, — сведка і саўдзельніца ўсіх тваіх вучнёўскіх перамог і падзенняў, усіх тваіх першых чалавечых учынкаў — добрых і не вельмі...

Я з таго часу, як школа перастала быць школай, ні разу ў яе не заходзіла, нават не спрабавала трапіць туды. Бо разумела, што там ужо ўсё па-іншаму, а хацелася думаць, што там — як было заўсёды. Што варта толькі зайсці на высокі ганак у зацені старых клёнаў — і пацягне прахаладай з калідора каля настаўніцкай, адкуль на перапынку чуваць галасы і смех, і будзе вісець на сцяне наша насценгазета, і будуць прыадчыненыя дзверы ў бібліятэку, і адтуль будзе прасочвацца таямнічы водар паперы і друкарскай фарбы...

Пакуль стаялі на зямлі гэтыя старыя сцены — верылася: так яно і ёсць. Трэба толькі збочыць у двор, прайсціся па старой алеі... Цяпер сцен не засталося — тыя, хто бачыў, казалі, што згарэла амаль усё, нягледзячы на намаганні пажарных. Мясцовай уладзе давядзецца вясной думаць, што рабіць на той гары, якая відаць адусюль, — не пакідаць жа на ёй папялішча. Магчыма, там з'явіцца новы сучасны будынак, а можа, пасадзяць дрэвы...

Але ва ўспамінах і ў снах некалькіх соцень людзей — розных узростаў, лёсаў, прафесій, раскіданых па ўсім былым Саюзе — на тым месцы застанецца старая драўляная школа. Будынкі — яны як людзі: не сыходзяць у небыццё, пакуль жывуць тыя, у каго яны ў памяці і ў сэрцы.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## Извещение о проведении 12.12.2018 года повторных аукционных торгов по продаже имущества, проводимых в электронной форме на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»

**Номер лота: 271118001.**

**Предмет электронных торгов (сведения о продаваемом имуществе):**

грузовой автомобиль ГАЗ-33023 фургон.

Гос. № АН 9247-7.

Год выпуска – 2004.

Двигатель – бензин.

Цвет – белый.

Наличие технического паспорта – имеется.

Техническое состояние – исправен.

Пробег – 348 тыс. км.

**Местонахождение продаваемого имущества**:

г. Минск, пр-т Победителей, 23.

**Продавец (собственник), организатор электронных торгов:**

**Республиканское унитарное предприятие «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова»:**

220004, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3-6, каб. 503.

Р/с BY48 AKBB 3012 0000 0751 2510 0000, в филиале № 510 ОАО «Беларусбанк», г. Минск, ул. Куйбышева, 18, код (BIC) AKBBBY21510.

ОКПО 381661635000, УНП 192240128. Тел./факс 219-48-21, 222-43-41.

**Оператор ЭТП:**

**республиканское унитарное предприятие «Институт недвижимости и оценки»,** 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, помещение 9.

**Адрес ЭТП:**http://торги.бел.

**Начальная цена предмета электронных торгов (с учетом НДС**):

**2 880,0** белорусских рублей (две тысячи восемьсот восемьдесят белорусских рублей).

**Шаг торгов:**

**5** процентов от начальной цены предмета электронных торгов.

**Сумма задатка:**

**288,0** белорусских рублей (двести восемьдесят восемь белорусских рублей).

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (далее – Регламент) и «Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.

**Для участия** в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу http://торги.бел, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с № BY68BPSB30121543370789330000, BIC банка BPSBBY2X в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а.

Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 271118001, который состоится 12.12.2018 10.00.

**Дата и время начала проведения электронных торгов:**

12.12.2018 года в 10.00 (по времени на сервере ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней после утверждения протокола.

2. Условия оплаты стоимости приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов: 100 % оплата в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.

3. Продавец обязуется передать Победителю электронных торгов (Претенденту на покупку) предмет электронных торгов в течение 20 (двадцати) календарных дней после 100 % оплаты предмета электронных торгов.

4. Самовывоз предмета (предметов) электронных торгов осуществляется Победителем электронных торгов (Претендентом на покупку) с места хранения предмета (предметов) электронных торгов.

5. Победитель электронных торов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней после утверждения протокола о результатах электронных торгов.

6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.

**Победитель электронных торгов** (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней после утверждения протокола.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по 07.12.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.30 по адресу: 220030 г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, помещение 6.

Дата и время окончания срока подачи заявок: 07.12.2018 в 15.00.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ». По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 306-44-98.

**Телефоны для справок:**

(РУП «ИНО») – (017) 324-70-57, (029) 550-09-52;

(РУП «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова») – (017) 219-48-21, 222-43-41.

## Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МинскСортСемОвощ»

### (220014, г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1) по решению наблюдательного совета Общества состоится в очной форме 11 декабря 2018 года

**Повестка дня собрания**

О приобретении открытым акционерным обществом «МинскСортСемОвощ» акций открытого акционерного общества «МинскСортСемОвощ», принадлежащих Республике Беларусь, на аукционе в торговой системе ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа».

Докладчик – председатель наблюдательного совета ОАО «МинскСортСемОвощ» Афанасьев А. Г.

Место проведения собрания: г. Минск, ул. Кузьмы Минина, д. 21, корп. 1, 4-й этаж, актовый зал.

Начало собрания: 9.00.

Время регистрации участников – в день проведения собрания с 08.30 до 08.55 по месту проведения собрания.

Время ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания – с 9.00 до 16.00 в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 3 декабря 2018 года, по адресу: г. Минск, ул. Кузьмы Минина 21, корп. 1.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра по состоянию на 3 декабря 2018 года.

Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров – по паспорту и доверенности.

Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ».

УНП 600052664

Утерянные страховые полисы формы 1-СУ, серии СВ «Квитанция о приеме наличных денежных средств» в количестве 19 штук № 7559901–7559919 в представительстве Белгосстраха по Минскому району **считать недействительными.**

УНП 100122726

ЗАО «СМУ-77» извещает своих акционеров о том, что отдельным акционером 26.11.2018 подано предложение о продаже принадлежащих им акций Общества в количестве 134 (сто тридцать четыре) штуки по цене 18 (восемнадцать) рублей за 1 (одну) акцию и отдельным акционером 27.11.2018 предложение о продаже 5 (пяти) простых акций по цене наминала. Тел./факс 017-344-23-21. УНП 100064641.

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «АГАТ-системы управления» – управляющая компания холдинга «Геоинформационные системы управления», г. Минск, пр-т Независимости, 117, пом. 1 |

**Предмет аукциона**

Недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 117/3

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **О 1/к Здание административно-хозяйственное** (здание административно-хозяйственное) | 64,6 кв. м | 500/С-41385 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6198** га предоставлен продавцу для эксплуатации и обслуживания зданий административно-хозяйственных и здания специализированного энергетики на праве аренды по 31.05.2052 (доля 59/100)

**Начальная цена с НДС 20 % – 68 640,00 бел. руб.**

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 30.10.2018 г.

**Аукцион состоится 19.12.2018 в 13.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 17.12.2018 до 17.00 по** указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. Email: auction@cpo.by**

**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и бланки страховых полисов:**

– квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№ 2268747, 2273354;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1643011, 1643012, 1639033, 1644617, 1752619, 1752656, 1752704, 1764958, 1764959.

УНП 100782388

### Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 |
| **Продавец** | Частное предприятие «СПОРТАВТО СЕРВИС», г. Минск, ул. М. Богдановича, 120-54 |

**Предмет аукциона**

**Месторасположение – г. Минск, ул. Уборевича, 103**

| Наименование | Назначение | Об. пл., кв. м | Инв. номер | № дома |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | | |
| **Помещение станции технического обслуживания автомобилей,** в т. ч. компрессорная, 6 кв. м | Помещения транспортного назначения | 926,8 | 500/D-798191027 | 103-101 |
| В состав лота входит оборудование: подъемники двухстоечные электрогидрав. 4 т – 5 шт., компрессор воздушный на 500 л, тумбочки инструментальные – 3 шт., пневмоинструмент – 3 шт. | | | | |
| **Начальная цена лота № 1 без НДС – 1 139 964 доллара США** | | | | |
| **Лот № 2** | | | | |
| **Помещение станции технического обслуживания автомобилей** | Помещения транспортного назначения | 88,3 | 500/D-798191026 | 103-1 |
| ***Наличие сервитута:*** в помещении расположен водомерный узел | | | | |
| **Начальная цена лота № 2 без НДС – 83 885 долларов США** | | | | |
| **Лот № 3** | | | | |
| **Административное (служебное) помещение** | Административные помещения | 40,7 | 500/D-798191029 | 103-304 |
| **Начальная цена лота № 3 без НДС – 38 665 долларов США** | | | | |
| **Лот № 4** | | | | |
| **Административное (служебное) помещение** | Административные помещения | 30,6 | 500/D-798191030 | 103-305 |
| **Начальная цена лота № 4 без НДС – 29 070 долларов США** | | | | |
| **Лот № 5** | | | | |
| **Административное (служебное) помещение** | Административные помещения | 32,1 | 500/D-798191022 | 103-413 |
| **Начальная цена лота № 5 без НДС – 30 495 долларов США** | | | | |
| **Лот № 6** | | | | |
| **Комната совещаний** | Административные помещения | 51,9 | 500/D-798191018 | 103-317 |
| **Начальная цена лота № 6 без НДС – 49 305 долларов США** | | | | |
| **Лот № 7** | | | | |
| **Административное (служебное) помещение с гардеробом** | Административные помещения | 55,1 | 500/D-798191021 | 103-411 |
| **Начальная цена лота № 7 без НДС – 52 345 долларов США** | | | | |

| | |
|---|---|
| **Обременения** | Лоты №№ 1–6 находятся в залоге у ОАО «Технобанк». Помещения сданы в аренду, кроме лота № 5. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона |

**По лоту №1 задаток 1%, а по лотам №№ 2–7 – 10 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения победителем торгов за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона – 11.01.2019** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 46, ООО «ИПМ-Консалт оценка». Дата и время окончания приема документов – 10.01.2019** до 17.00 по указанному адресу

**Контактные тел.: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@ipmconsult.by. Интернет сайт www.cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

### Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавцы** | ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9. ООО «Газпром комплектация», РФ, г. Москва, ул. Строителей, д. 8, стр. 1 |

**Предмет аукциона**

**Доли в уставном фонде ООО СП «Спецкомплектимпэкс», реализуемые одним лотом**

1. Доля в уставном фонде ООО СП «Спецкомплектимпэкс» в размере 50 %, принадлежащая ОАО «Газпром трансгаз Беларусь».
2. Доля в уставном фонде ООО СП «Спецкомплектимпэкс» в размере 50 %, принадлежащая ООО «Газпром комплектация»

**Дополнительная информация:** совместное Белорусско-Российское предприятие «Спецкомплектимпэкс» создано в сентябре 1993 г. в форме общества с ограниченной ответственностью для организации поставок материально-технических ресурсов в счет погашения задолженности Республики Беларусь за поставленный природный газ. Согласно Свидетельству о государственной регистрации предприятия с иностранными инвестициями Министерство внешних экономических связей Республики Беларусь решением от 27.12.1996 г. № 19 зарегистрировало ООО СП «Спецкомплектимпэкс» в Реестре общереспубликанской регистрации за № 1079 (регистрация изменения наименования МИД 21 июня 2000 г. № 1079/2) присвоен ЕГР № 100349674. Дата выдачи свидетельства: 23 июня 2000 г. **Виды деятельности:** оказание услуг по сдаче в аренду объектов недвижимости, расположенных в Минском районе на территории производственной базы. **Место нахождения:** 220004, г. Минск, ул. Короля, дом 9, пом. 13

| | |
|---|---|
| **Начальная цена предмета аукциона без НДС** | **0,05 бел. руб.** |

**Задаток 0,05 бел. руб.** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30 рабочих дней после проведения аукциона** |

**Условие аукциона**: в течение 30 дней после подписания договора покупатель обязан внести изменение в Устав ООО СП «Спецкомплектимпэкс» и зарегистрировать данные изменения в установленном порядке в Минском городском исполнительном комитете

**Порядок оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **WWW.CPO.BY.** Покупатель обязан возместить организатору аукциона затраты на его проведение и оплатить вознаграждение в размере 5 (пяти) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **04.01.2019** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **02.01.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Несвижский завод медицинских препаратов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **комплекта оборудования для выдува ПЭТ-бутылок, инв. № по бух. учету 050802, в составе:**

**– полуавтомат выдува ПЭТ-бутылок СП-8У-16, заводской № 0280309;**

**– полуавтомат выдува ПЭТ-бутылок СП-8У-16, заводской № 0290309;**

**– станция разогрева преформ СП-8/2 (ТС), заводской № 0390309;**

**– пресс формы для выдува бутылок объемом V=0,1 л (комплект 2 шт.).**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 13 741,42 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 374,00 бел. руб.). Стоимость снижена на 47 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.10.2018. Аукцион состоится **14.12.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.12.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению торгового унитарного предприятия «Облкоопторг» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **магазина розничной торговли общей площадью 78,0 кв. м, инв. № 600/С-159626, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623688207101000059 (предоставлен на праве аренды) площадью 0,0395 га по адресу: Минская область, Минский район, Юзуфовский с/с, д. Сады, 1Б.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **4 500,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **450,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 70 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.10.2018. Аукцион состоится **14.12.2018** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.12.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# ЧАЛАВЕК, ЯКІ СТВАРЫЎ СІСТЭМУ

**Наш суразмоўнік, дзяржаўны служачы першага класа, выдатнік фінансавай сістэмы Вячаслаў Балібок, заўтра адзначае 70-годдзе. Вячаслаў Дзмітрыевіч унёс значны ўклад ва ўдасканаленне бюджэтнай сістэмы краіны і развіццё страхавой справы, пра што сказана, дарэчы, і ў Ганаровай грамаце Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.**



Пунсовыя ветразі — шчаслівы сімвал «Белэксімгаранта».

## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎНІКА

*Вячаслаў Дзмітрыевіч сваю працоўную дзейнасць пачынаў у фінансавым упраўленні Мінаблвыканкама. На розных пасадах прайшоў тут сур'ёзную прафесійную школу.*

*Пазней працаваў намеснікам начальніка бюджэтнага ўпраўлення Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, у Кантрольнай палаце. Прыкметнымі вехамі працоўнай біяграфіі сталі няпростыя клопаты намесніка старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» і намесніка генеральнага дырэктара Белдзяржстраха.*

*Калі было створана Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант», рашэннем урада прызначаны яго генеральным дырэктарам.*

*Пасля выхаду на пенсію — дарадца па эканамічных пытаннях старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь.*

*Жанаты.*

***— Паважаны Вячаслаў Дзмітрыевіч, часта чалавек лічыць, што гэта ён выбірае прафесію. На самай справе прафесія выбірае нас. А як было ў вас?***

— Мой жыццёвы шлях вызначыўся пасля паступлення ў Мінскі фінансава-эканамічны тэхнікум, што знаходзіцца ў падпарадкаванні Мінфіна Рэспублікі Беларусь. Гады вучобы тут я заўсёды ўспамінаю з асаблівай цеплынёй і ўдзячнасцю ўсяму калектыву выкладчыкаў. Тут на ўласным прыкладзе адчуў, што сапраўдны настаўнік заўсёды дае значна больш, чым вызначана вучэбнай праграмай. Ён дапамагае маладому чалавеку зразумець сябе, раскрыць самыя лепшыя чалавечыя якасці, знайсці ў выніку ўласную дарогу ў жыцці.

Менавіта такім настаўнікам стаў для мяне тагачасны дырэктар тэхнікума Дзмітрый Ягоравіч Кавалёў. Ён змог пераканаць, што спецыяльнасць «дзяржаўны бюджэт» — гэта найлепшае, што патрэбна маладому чалавеку, які думае пра веды і будучую кар'еру. Цікавы факт: больш за палову сённяшніх супрацоўнікаў Міністэрства фінансаў і тых арганізацый, што яму падпарадкаваны, пачыналі сваю прафесійную вучобу ў гэтай навучальнай установе. Як і яны, я таксама ўдзячны лёсу за студэнцкія гады, гэта быў цудоўны час.

***— Па размеркаванні вы трапілі ў фінансавае ўпраўленне Мінаблвыканкама, што на той час было вельмі крута...***

— У актыве ў мяне былі малады запал, служба ў арміі і дыплом з адзнакай тэхнікума. Думаю, усё гэта разам і вызначыла маё першае месца працы.

Фінансавае ўпраўленне Мінаблвыканкама — унікальны калектыў інтэлігентных і вельмі прафесійных людзей. Магчыма, гэта нават найлепшая супольнасць з тых, што я потым сустракаў. Не будзе перабольшаннем сказаць, што Павел Карпавіч Зайцаў, Пётр Станіслававіч Ліхтаровіч, Вадзім Афанасьевіч Шахлевіч, Павел Іванавіч Туронак, Антон Антонавіч Каласко, а разам з імі і шэраг іншых супрацоўнікаў з'яўляліся залатым фондам фінансавай сістэмы Міншчыны і нашай краіны.




Створаны В. Д. Балібокам і М. А. Зайцавай пры падтрымцы «Белэксімгаранта» і Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта падручнік «Страхаванне ў знешнеэканамічнай дзейнасці» надзвычай запатрабаваны ў вышэйшых навучальных установах Беларусі і Расіі.

Варта асобна сказаць пра загадчыка фінансавага ўпраўлення, тады гэта быў Павел Карпавіч Зайцаў. Павага да яго такая, што хочацца назваць яго вялікім грамадзянінам мінскай зямлі (нарадзіўся ён у Крупскім раёне). Павел Карпавіч умеў спакойна, канструктыўна і эфектыўна вырашаць самыя складаныя фінансавыя задачы і дабівацца максімальных вынікаў.



За больш чым дваццаць гадоў кіраўніцтва (з 1978-га да 2001-га) яму ўдалося забяспечыць якаснае складанне і выкананне бюджэту вобласці, а гэта рэгіён, дзе паўтара мільёна насельніцтва і больш за 400 прадпрыемстваў. І ўсё дзякуючы таму, што пастаянна ўдасканальваліся формы і метады фінансавай работы. У не вельмі простыя дзевяностыя гады ён умела правёў структурныя пераўтварэнні ў фінансавым упраўленні. Быў абраны дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 13-га склікання.

Павел Карпавіч рана пайшоў ад нас. Сваёй яркасцю як асобы, чыста чалавечай абаяльнасцю ён суправаджаў мяне ва ўсіх маіх творчых перамогах. Калі працуеш побач з такімі людзьмі, то міжволі імкнешся падцягнуць сябе да іх узроўню.

Сімбіёз у адным калектыве дзяржаўных людзей, з якіх можна было браць прыклад, і маладых спецыялістаў, што імкнуліся дасягнуць высокай прафесійнай планкі, дазволіў фінансаваму ўпраўленню Мінскага аблвыканкама выхаваць такіх вядомых людзей, як В. В. Амарын, М. П. Корбут, А. І. Сверж, В. В. Дашкевіч, В. В. Лушчыцкі, Н. К. Лісай, І. С. Шунько і іншых, хто сёння з'яўляецца гонарам фінансавай сістэмы.

***— Важным этапам вашай біяграфіі стала праца ў Міністэрстве фінансаў Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, набліжаецца 100-годдзе гэтай паважанай дзяржаўнай установы. Каго б вам хацелася адзначыць, пра каго сказаць добрае слова?***

— Без перабольшання твар нашай Беларусі XX стагоддзя — такія людзі, як тагачасны міністр фінансаў Баляслаў Іосіфавіч Шаціла. Ён прытрымліваўся дэмакратычнага стылю кіравання, асабіста займаўся найбольш складанымі праблемамі, давяраючы падначаленым самастойна вырашаць усе астатнія пытанні адпаведна іх кваліфікацыі. І заўсёды такім чынам дабіваўся максімальнага эфекту. Патрабавальны да сябе і іншых, ён, між іншым, клапаціўся не толькі аб прафесійным, але і каб кадравым росце маладых: сачыў, каб годныя работнікі райфінаддзелаў пераходзілі з цягам часу ў аблфінаддзелы, а спецыялістаў абласнога звяна запрашалі на работу ў Мінфін.

Мне міністр персанальна двойчы даваў магчымасць працаваць у апараце Мінфіна, і я з удзячнасцю ёю карыстаўся. Дарэчы, Баляслаў Іосіфавіч знаходзіўся на сваёй няпростай пасадзе даўжэй, чым хто, — з 1965-га да 1990 года, гэта значыць, чвэрць усяго тэрміну дзейнасці міністэрства.

Цалкам лагічна ўспомніць пра яго выхаванца і майго непасрэднага кіраўніка — начальніка бюджэтнага ўпраўлення, а пазней намесніка міністра фінансаў Мікалая Філіпавіча Румаса. Амаль у кожным міністэрстве, ведамстве ёсць людзі, якія валодаюць энцыклапедычнымі ведамі і могуць у крытычны момант падказаць адзіна правільнае рашэнне. Такой застаецца ў памяці яркая асоба Мікалая Філіпавіча. А праца ў бюджэтным упраўленні стала для мяне вызначальнай.

***— Пад патранажам Мінфіна, Нацбанка і ААТ «ААБ Беларусбанк» у пачатку 2001 года ў краіне ствараецца новае страхавое агенцтва для абароны інтарэсаў прадпрыемстваў, якія працуюць на экспарт. Наша газета ў той час даволі цесна з вамі супрацоўнічала, і я дакладна ведаю, што ініцыятыва ішла ад вас і вы былі тым рухавіком, які «накручваў усе спружыны». А згаданыя вышэй паважаныя інстанцыі добра разумелі неабходнасць страхавання знешнеэканамічных рызык і ўсяляк падтрымлівалі. Савет Міністраў прызначыў вас генеральным дырэктарам. Ці лёгка было запусціць у жыццё нязвыклы для краіны кірунак дзейнасці?***

— Калі нехта стварае нешта новае, той разумее, наколькі шматгранны гэты шлях. Нават ужо пасля прыняцця рашэння. Спатрэбілася аператыўна ствараць нарматыўную базу, фарміраваць каманду, шукаць сродкі для статутнага фонду і вырашаць многія іншыя пытанні. Сапраўднай удачай было тое, што на гэтым шляху сустрэліся сапраўды дзяржаўныя людзі, якія разумелі важнасць задачы і падставілі плячо. Велізарная ўдзячнасць усім ім, асабліва Мікалаю Пятровічу Корбуту, які ў якасці міністра фінансаў падтрымаў новую структуру на ўсіх этапах.

А роднае бюджэтнае ўпраўленне міністэрства, як магло, таксама паспрыяла выдзяленню бюджэтных сродкаў пры страхаванні экспартных кантрактаў, а яшчэ ўваходжанню «нованароджанага» прадпрыемства асобным радком у бюджэт краіны.

Усе зыходзілі з таго, што Беларусь да гэтага часу не мае экспартнага страхавога агенцтва, пры тым, што ва ўсіх развітых краінах свету яны існавалі ўжо доўгі час. Напрыклад, у Германіі — Euler Hermes, у Чэхіі — EGAP, у Польшчы — KUKE, Венгрыі — MEHIB і гэтак далей. Сапраўды, айчынныя экспарцёры павінны мець роўныя магчымасці са сваімі замежнымі контрагентамі ў галіне крэдытных і страхавых стасункаў. Толькі на такіх умовах можна было развіваць экспарт у краіне са сваёй асаблівай эканомікай. Так што з'яўленне Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» стала заканамернасцю.

Існуе слушная думка: «Калі ты разбіраешся ў тэхналогіі, значыць, яна ўжо ўстарэла». Скажу шчыра, што сама тэхналогія функцыянавання новага прадпрыемства была цалкам нязвыклай для Беларусі. Пачынаць даводзілася ў многіх выпадках з чыстага, што называецца, ліста і з абавязковым улікам усяго найлепшага, на што былі багатыя аналагічныя замежныя кампаніі.



Людзі справы, якім за перамогу ў папулярным конкурсе ўручаюць вось такую сімвалічную (і сімпатычную) скульптурку, — сапраўднае багацце нацыі. Вячаслаў Дзмітрыевіч — «Чалавек года — 2009».

Сёння веды вельмі хутка старэюць, і важна нават не тое, што ты ведаеш, а як хутка ты ўмееш вучыцца. Разумеючы гэта, мы старанна вучыліся ўсе разам — кампетэнтнасці, стратэгічнаму кіраванню, самаўдасканаленню, прадпрымальнасці і многаму іншаму. І ўсё для таго, каб стаць лідарам у гэтай сферы дзейнасці.

Адным словам, было зусім не проста. Пераломным момантам стаў выхад Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 534 ад 25.08.2006 года «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў, работ, паслуг», які не толькі замацаваў выключнае права на правядзенне страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы за «Белэксімгарантам», але і вызначыў усю метадалогію сістэмы экспартнага страхавання ў краіне. Тым самым Беларусь стала ў адзін шэраг з перадавымі краінамі, якія даўно маюць нарматыўна-прававыя акты, што рэгламентуюць функцыянаванне нацыянальных сістэм стымулявання экспарту. Хачу падкрэсліць гэтую думку: зараз у краіне дзейнічае нацыянальная сістэма стымулявання і абароны экспарту.

***— Сёння «Белэксімгарант» моцна стаіць на нагах, ён пазнавальны і запатрабаваны...***

— Абсалютна правільна, пазнавальны і запатрабаваны. Тут шмат залежыць ад тых, хто знаходзіцца, як кажуць, каля руля. Дзесяць гадоў назад я перадаў штурвал у надзейныя рукі. З таго часу Генадзь Антонавіч Міцкевіч разам з сваёй камандай умела і эфектыўна кіруе нашым караблём пад пунсовымі ветразямі ў бурным моры-акіяне рынку.

Унутры краіны страхавое прадпрыемства мае дагаворы з вядучымі экспарцёрамі — такімі як ААТ «МАЗ» і «Белаз», РУП «МТЗ», ААТ «Белкамунмаш», СП «Беліта», ЗАТ «Атлант» — пералік можна доўжыць. Толькі за перыяд з 2007 да 2015 года заключаецца каля 50 тысяч дагавораў страхавання экспартных рызык, а сума страхавога пакрыцця экспарту тавараў дасягае больш як 4,3 мільярда долараў ЗША.

***— Успомнім, што «Белэксімгарант» — першая страхавая кампанія Беларусі, якая атрымала міжнародны рэйтынг фінансавай устойлівасці «B».***

— Так, у міжнародным рэйтынгавым агенцтве Fitch Ratings. Невыпадкова наша краіна стала свайго роду ўсходняй пляцоўкай, дзе на базе «Белэксімгаранта» экспартна-крэдытныя агенцтвы іншых краін свету Бернскага саюза ўдасканальваюць свае прафесійныя веды і адначасова паступова мяняюць сваю думку наконт групы палітычнай рызыкі Рэспублікі Беларусь.

Прэстыжна і тое, што двойчы ў Мінску праводзіліся міжнародныя канферэнцыі Бернскага саюза. Іх удзельнікі (кожны раз — з больш чым 40 краін свету) атрымалі магчымасць вывучыць эканамічны патэнцыял рэспублікі, абмяняцца досведам правядзення страхавання экспартных крэдытаў і ўмацавання андэррайтынгавай палітыкі.

berneunion

«Белэксімгарант» мае ўласны раздзел-прэзентацыю ў штогадовай справаздачы Бернскага саюза, яна выдаецца ў Лондане і распаўсюджваецца ва ўсім свеце. Прадпрыемства расце і развіваецца, мае філіяльную сетку. Тым самым дэманструючы, ШТО менавіта адрознівае па-сапраўднаму таленавітую кампанію ад проста ўдалага бізнес-праекта. Тут працуюць людзі, здольныя мысліць і працаваць творча, прадпрымальна, эфектыўна. У пацвярджэнне прывяду такі факт: пасля прафесійнай школы «Белэксімгаранта» многія яго супрацоўнікі ўзначалілі вельмі адказныя напрамкі ў краіне.

***— Сярод іх ёсць і вашы выхаванцы, давайце назавём імёны.***

— А. В. Скрага стаў генеральным дырэктарам «Белспецзнештэхнікі», В. А. Войцік — генеральным дырэктарам УСП «Белзнешстрах», Г. В. Цімашэвіч — генеральным дырэктарам СТАА «Белкаапстрах» і гэтак далей.

Яркіх асоб, хто працаваў побач, заўсёды было многа. Часткова я назваў іх імёны ў самым пачатку нашай гутаркі, але напярэдадні знамянальнай для Міністэрства фінансаў краіны даты хацелася б згадаць таксама Н. А. Ермакову, А. В. Кабякова, Г. І. Кумпіцкага, Г. А. Міцкевіча, В. І. Сямашку, В. І. Шуста — працягваць можна доўга. Усё гэта людзі высокага выніку. Беларуская зямля ўраджайная на таленты, а ў прафесіі фінансіста, дзяржаўнага чалавека без своеасаблівага таленту не абысціся.

Хачу пажадаць, каб лёс і далей быў добразычлівы да людзей гэтай няпростай, клапатлівай галіны, гэтай прафесіі, не шкадаваў для іх удач. А за іх поспехамі стаіць дабрабыт суайчыннікаў.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Здымкі з архіва В. Д. БАЛІБОКА і «Белэксімгаранта».**

УНП 101421509
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 2200/13-00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзены Міністэрствам фінансаў РБ 23 красавіка 2008 года.

**Ад рэдакцыі**

*Як вядома, цаліну ўздымаюць першапраходцы, гарады бяруць военачальнікі, а любую новую справу пачынаюць людзі няўрымслівыя, творчыя, прафесіяналы з вялікай літары. Менавіта такім на працягу многіх гадоў супрацоўнікі нашай газеты ведаюць Вячаслава Дзмітрыевіча Балібока — былога намесніка старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк», першага генеральнага дырэктара Беларускага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант». Гэтае вельмі патрэбнае эканоміцы рэспублікі прадпрыемства было створана ў значнай ступені дзякуючы яго ініцыятыве і разуменню сітуацыі на сусветным рынку. Практыка пацвердзіла вялікую карысць дзяржаўнай падтрымкі экспарту стараннямі калектыву агенцтва. І вытворцы не раз казалі заслужаны і шчыры «дзякуй!».*

*Паважаны Вячаслаў Дзмітрыевіч! Мы далучаемся да ўсіх цёплых слоў у Ваш адрас. Віншуем з цудоўнай датай і жадаем моцнага здароўя, аптымізму, дабрабыту. І новых дзесяцігоддзяў шчаслівага жыцця наперадзе.*

*Звяздоўцы.*

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні варта пусціць у ход усю вашу дыпламатычнасць, каб пазбегнуць сур'ёзнай сваркі з начальствам або са старэйшымі сваякамі. Не бярыцеся за выкананне звышзадач, гэтым вы можаце падарваць здароўе і сапсаваць адносіны са сваёй палавінай. Не да месца кінутая фраза пагражае паслужыць прычынай непаразумення ў сям'і ў выхадныя.

**ЦЯЛЕЦ.** Пажадана дакладна спланаваць справы на гэтым тыдні, у адваротным выпадку ён будзе некалькі хаатычным. Не варта загадзя перажываць з нагоды перамен, якія чакаюцца на рабоце. Будзьце ўважлівыя і клапатлівыя ў адносінах да каханага чалавека, бо яму не хапае вашага душэўнага цяпла. Пачынаючы з серады ёсць верагоднасць паступлення каштоўнай для вас інфармацыі з зусім нечаканай крыніцы.

**БЛІЗНЯТЫ.** Развіццё падзей будзе шмат у чым залежаць ад вашага погляду на праблему, не дазваляйце сабе песімізм. Зрэшты, для яго не будзе асаблівай падставы. Зоркі абяцаюць бурны раман або прыбытак у сям'і. Вашы ідэі прынясуць патрэбны вынік і прыбытак. У другой палове тыдня з'явіцца магчымасць для самарэалізацыі ў творчасці і дадатковага заробку. Вы цяпер здольныя зрынуць горы, паказаць сябе ва ўсім бляску.

**РАК.** Падобна на тое, што надыходзіць час сур'ёзнай праверкі вашых дыпламатычных якасцяў. На гэтым тыдні ўсё залежыць ад таго, як хутка ператворыце сапернікаў у саюзнікаў. У панядзелак настойлівая ветлівасць або ветлівая настойлівасць стане залогам поспеху. У аўторак і ў сераду трэба будзе шмат кантактаваць з партнёрамі па рабоце і бізнесу для вызначэння перспектыў на найбліжэйшую будучыню. У пятніцу адчуеце неабходнасць у падтрымцы, але не варта паказваць сваю слабасць усім і кожнаму. Давярайце толькі блізкім людзям.

**ЛЕЎ.** Непажадана паўтараць свае памылкі толькі таму, што вам зручней хадзіць па пратаптанай сцежцы. Не варта марнаваць час на будаўніцтва паветраных замкаў. Значна больш карысна будзе паклапаціцца пра зямное. Прычым можна выкарыстоўваць самыя разнастайныя метады, у тым ліку і інтрыгі, галоўнае — увага да дробязяў і ўменне аналізаваць. У другой палове тыдня вам могуць даручыць складаную і адказную работу, і вы з ёй справіцеся.

**ДЗЕВА.** Напружаная работа ў пачатку тыдня можа аслабіць вашы сілы, але фінансавыя перспектывы стануць больш зразумелымі і прыемнымі, што акупіць усе нягоды. У чацвер варта знізіць напал і знайсці час для адпачынку. У пятніцу скрытыя праблемы, якія хвалявалі, стануць відавочнымі, і вы зможаце прыняць своечасовыя меры па іх вырашэнні. У суботу самы час зрабіць тое, што вы даўно сабе абяцалі, але раней не маглі дазволіць. У нядзелю парадуе каханы чалавек.

**ШАЛІ.** Прыйшоў час радавацца жыццю і ўмела выкарыстоўваць існуючыя магчымасці. Тыдзень спрыяльны для змен, пачаць можна са свайго іміджу, працягнуць стылем зносін, а там атрымаецца і новую работу знайсці. Усё пераменіцца выключна да лепшага. Аўторак — удалы дзень для размоў і перамоў. Выхадныя дні — выдатны час для зносін з раднёй і дзецьмі, удасца абысціся без канфліктаў.

**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні можаце здзейсніць прарыў да новых вышынь. Дапамога сяброў або знаёмых станецца вельмі важнай. Засяродзьцеся на рабоце, яна прынясе задавальненне і прыбытак. У панядзелак можа зацікавіць новая карысная інфармацыя, у сераду без цяжкасцяў зможаце атрымаць адабрэнне начальства. Магчыма новая выгадная прапанова ў працоўнай або асабістай сферы, якую варта прыняць.

**СТРАЛЕЦ.** У першай палове тыдня верагодныя разнастайныя кантакты: сустрэчы, паездкі па справах і іншыя клопаты. Захочацца скінуць з сябе цяжар абавязкаў, раптам надакучыць вучыцца або працаваць. На шчасце, да канца тыдня гэты настрой знікне без следу. За вас вашы справы ніхто не зробіць. У чацвер станеце шчаслівым уладальнікам дару перакanання, лёгка дасягаючы жаданага выніку. Выхадныя могуць падарыць спрыяльную магчымасць для змены абстаноўкі.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні будуць своечасовымі разважанні пра сэнс жыцця і пра сваё месца ў гэтым свеце. Аднак усё ж не забывайцеся пра надзённае, найбліжэйшыя мэты. Давядзецца разбірацца са старымі праблемамі і па-іншаму будаваць адносіны з навакольнымі людзьмі. Самы час змяніць рамантычныя прыхільнасці і пазбавіцца ад адносін, калі вам з партнёрам некамфортна.

**ВАДАЛІЙ.** Варта звярнуць увагу на знакі, якія вам пасылае лёс. А вось папярэджвае ён вас аб небяспецы або звяртае ўвагу на ўдалы збег абставін — зможаце разгадаць толькі вы самі. У панядзелак не грэбуйце дробнымі даручэннямі: хто ведае, можа быць, менавіта там вы дасягнеце поспеху. У чацвер і пятніцу пажадана ўстрымацца ад авантур і зблізіцца з незнаёмцамі.

**РЫБЫ.** Работа можа запатрабаваць занадта шмат намаганняў, таму лепш адразу вырашыць для сябе, з якім яе аб'ёмам вы можаце рэальна справіцца. І ні ў якім разе не згаджацца на павелічэнне гэтага ліміту. Не марнуйце час на дробныя задачы і пустыя размовы, засяродзьцеся на галоўным. Не шкадуйце сіл на праверку надзейнасці новых партнёраў, толькі тады ёсць сэнс пачынаць сумесныя праекты. У вачах начальства варта быць як мага больш непрыкметным і сціплым.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.03 | 16.53 | 7.50 |
| Віцебск — | 8.59 | 16.36 | 7.37 |
| Магілёў — | 8.53 | 16.43 | 7.50 |
| Гомель — | 8.42 | 16.47 | 8.05 |
| Гродна — | 9.17 | 17.10 | 7.53 |
| Брэст — | 9.10 | 17.18 | 8.08 |

## Месяц

*Апошняя квадра ў 3.19. Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

*Пр. Лазара, Міхаіла, Нікана, Рыгора, Сяргея. К. Канстанцыі, Маўры, Юстыны, Андрэя, Канстанціна, Людаслава.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 30 ЛІСТАПАДА

**У краіне**

**1903** год — нарадзіўся Раман Навумавіч Мачульскі (в. Крываносы, цяпер у Старадарожскім раёне), дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза. З 1937 года на партыйнай рабоце ў Грэскім, Чэрвеньскім, Плешчаніцкім раёнах. У Вялікую Айчынную вайну — сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б, выконваючы абавязкі камандзіра Мінскага партызанскага злучэння, са жніўня 1943-га — камандзір партызанскага злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны. Пасля вайны быў на партыйнай і савецкай рабоце, сакратар Пінскага абкама КП(б)Б, у 1954—1959 гадах — старшыня Брэсцкага аблвыканкама. Аўтар мемуараў «Старонкі бессмяротнасці», «Людзі высокага абавязку», «Вечны агонь», «На вогненнай зямлі». Памёр у 1990 годзе.

**1928** год — нарадзілася (г. Віцебск) Галіна Аляксандраўна Арлова, народная артыстка Беларусі. З 1959 года — актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы. Выканаўца характарных і драматычных роляў. Сярод найлепшых: Ягадка («Амністыя» М. Матукоўскага), Алена («Жаніцьба Бялугіна» А. Астроўскага), Нэлі («Прыніжаныя і зняважаныя» Ф. Дастаеўскага) і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.



**1943** год — адбыўся бой паміж 425-м партызанскім палком (камандзір Ф. Ф. Сухаў) і карным атрадам гітлераўцаў у в. Гарадзец Быхаўскага раёна, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Гарадзецкі бой. Камандаванне партызанскага атрада стала вядома, што карнікі ўвайшлі ў вёску Гарадзец, жыхароў гэтай і суседніх вёсак (больш за 70 жанчын, старых і дзяцей) замкнулі ў хлявах і збіраліся спаліць 1 снежня 1943 года. Позняй ноччу партызаны нечакана атакавалі гітлераўцаў. У выніку жорсткага бою, які пераходзіў у рукапашныя сутычкі, 66 карнікаў былі знішчаны, а ўсе мясцовыя жыхары выратаваны.

**У свеце**

**1667** год — нарадзіўся Джонатан Свіфт, англійскі пісьменнік-сатырык і палітычны дзеяч. Аўтар рамана «Падарожжа Гулівера». Памёр у 1745 годзе.

**1810** год — дата нараджэння Олівера Вінчэстэра, амерыканскага вынаходніка і вытворцы стралковай зброі. У 1860 годзе прыступіў да вытворчасці крамнай вінтоўкі «Генры», на аснове якой пасля была створана шматзарадная наразная вінтоўка (вінчэстар). Папулярная мадэль 1870 года шырока выкарыстоўвалася паляўнічымі, часта фігуруе ў вестэрнах як каўбойская зброя.

**1835** год — нарадзіўся Марк Твэн, амерыканскі пісьменнік. Аўтар раманаў «Прыгоды Тома Соера», «Прыгоды Гекльберы Фіна», цыкла гістарычных раманаў-прыпавесцяў, у тым ліку «Янкі з Канэктыкута пры двары караля Артура» і інш. Памёр у 1910 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Юбілейную сустрэчу аднакласнікаў было вырашана арганізаваць на акіянскай яхце двоечніка Сідарава.**

У тэатры, два акцёры.
— Ведаеце, калега, я захоплены тым, як вы працуеце, але ў адным дазволю сабе папракнуць вас...
— У чым жа?
— Вы залішне жорстка ставіцеся да гледачоў.
— Чаму?
— Калі вы сыходзіце са сцэны, вы занадта гучна тупаеце і будзіце публіку.

**Першае дзіця — усё мыем, прасуем, кіпяцім!**
**Другое дзіця — мыем, часам прасуем, глядзім, каб не еў з міскі ката.**
**Трэцяе дзіця — калі дзіця паела з міскі ката, гэта праблемы ката...**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4178.
Нумар падпісаны ў 19.30 29 лістапада 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

30 лістапада 2018 г. № 48 (481)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ





УВАГА!

ПРАПАНУЕМ ПАДПІСАЦЦА на пятнічны нумар газеты «Звязда» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» (выходзіць штотыднёва).

Для фізічных асоб – 633072

Для юрыдычных асоб – 63307

Аформіць падпіску можна на тэрмін ад аднаго месяца да паўгода.


ЗАНЯТАСЦЬ

# З УЛІКАМ УСІХ ЖЫЦЦЁВЫХ АБСТАВІН



## Як будзе дзейнічаць на практыцы Дэкрэт № 3: раскладваем па паліцах

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**УЖО заўтра, 1 снежня, запрацуе база не занятых у эканоміцы грамадзян. А з пачатку наступнага года тыя, хто трапіў у яе, будуць аплачваць асобныя камунальныя паслугі па стапрацэнтным тарыфе.**

**Каго закрануць гэтыя змены і наколькі «пацяжэюць» жыроўкі — падрабязна тлумачым усе новаўвядзенні, звязаныя з Дэкрэтам № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва».**

### Хто лічыцца занятым у эканоміцы?

Тыя, хто працуе па кантракце ці дагаворы падраду, заняты на дзяржаўных пасадах, знаходзіцца ў вытворчым кааператыве ці фермерскай гаспадарцы. Сюды ж адносяцца прадпрымальнікі і фізічныя асобы, што працуюць без рэгістрацыі ІП і сплачваюць адзіны падатак, рамеснікі, адвакаты, натарыусы. Калі вы аказваеце паслугі ў сферы аграэкатурызму ці з'яўляецеся творчым работнікам (статус пацвярджаецца членствам у творчым саюзе або прафесійным сертыфікатам), то таксама лічыцеся занятымі ў эканоміцы.

У гэту катэгорыю ўключаюць вайскоўцаў, работнікаў ваенізаваных арганізацый, якія маюць спецыяльныя званні, рэзервістаў і ваеннаабавязаных падчас праходжання збораў, грамадзян, якія знаходзяцца на альтэрнатыўнай службе. А таксама служыцеляў царквы, членаў манаскай супольнасці і навучэнцаў духоўных семінарый.

Занятымі з'яўляюцца і грамадзяне, якія маюць ва ўласнасці зямельны ўчастак для вядзення падсобнай гаспадаркі (ці агародніцтва, традыцыйных народных промыслаў, іншых мэт) і вырошчваюць там прадукцыю раслінаводства (акрамя кветак, дэкаратыўных раслін, іх насення і расады) ці разводзяць жывёл. Але гэта правіла не датычыцца тых, у каго надзел у сталіцы і абласных цэнтрах.


ПРАЦЯГ — на 15-й стар.


ПАРТНЁР ТЭМЫ ТЫДНЯ:





телефон: +375 2233 5 20 16
факс: +375 2233 5 19 43
e-mail: gorkimsz@tut.by

Адрес: Республика Беларусь, 213410, г. Горки, ул. Мира, 19

УНП 700101290


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Праекты, асвета, вопыт




Над чым працуюць першыя асацыяцыі мясцовых Саветаў. стар. 4


### «Ні прайсці, ні праехаць...»




Чаму ў Мінскім раёне 1700 км «нічыйных» дарог? стар. 14


### Навучаць аграбізнесу




У Аршанскім раёне стартуе сацыяльны праект для сельскіх жанчын. стар. 15


### Крокі да экалогіі




«МС» працягвае інтэрактыўны праект з чытачамі. стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



# Дорожная карта сотрудничества

**Белорусская делегация во главе с заместителем председателя Совета Республики Национального собрания Беларуси Марианной ЩЕТКИНОЙ посетила Узбекистан.**

Парламентарий встретилась с заместителем премьер-министра этой страны, сопредседателем совместной межправительственной комиссии по двустороннему сотрудничеству между Беларусью и Узбекистаном Нодиром Отажоновым.

Что обсуждали? В первую очередь ход реализации договоренностей, достигнутых на высшем уровне по итогам официального визита Президента Александра Лукашенко в Узбекистан в сентябре текущего года.

Во время встречи стороны обратили внимание на необходимость активизации усилий по реализации плана мероприятий — дорожной карты — по развитию сотрудничества двух стран.

Во второй день визита Марианна Щеткина встретилась с председателем Сената Олий Мажлиса Узбекистана Нигматиллой Юлдашевым. Кроме того, вице-спикер верхней палаты белорусского парламента провела встречу с вице-спикером Законодательной палаты Олий Мажлиса Сарваром Отамуратовым.

Помимо обсуждения двустороннего межпарламентского сотрудничества, Марианна Щеткина представила концепцию подготовки первого Форума регионов Беларуси и Узбекистана, который планируется провести в 2019 году в Минске. Стороны определили координаторов для подготовки события.

Кроме того, во время визита было подписано соглашение о сотрудничестве между Белорусским союзом женщин и Ассоциацией деловых женщин Узбекистана. Помимо всесторонней поддержки, оно предусматривает разработку совместного плана работы на следующие два года.

# Что волнует?

**Члены Президиума Совета Республики провели выездные личные приемы.**

Так, **председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по экономике, бюджету и финансам Владимир ПАНТЮХОВ** провел прием граждан в Могилевском городском исполнительном комитете. Людей интересовали вопросы социально-экономического развития региона, трудоустройства, эффективного использования зданий и сооружений, развития волейбола, а также выделения денежных средств на строительство новых объектов.

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по законодательству и государственному строительству Алла БОДАК** провела прием граждан на базе ОАО «Галантэя». Поднимались темы строительства, порядка заключения договоров долевого строительства жилья, а также предоставления в безвозмездное пользование помещений для занятия детьми физической культурой и спортом.

# Опираясь на местную стратегию

*В Бресте обсуждали цели и перспективы устойчивого развития*

Первая в республике встреча региональных групп по достижению Целей устойчивого развития на местном уровне прошла в Бресте. Участники семинара сначала ознакомились с работой брестского научно-технологического парка, затем обменялись опытом работы по привлечению инвестиций в перспективные проекты, которые реализуются и планируются в разных регионах страны.

**Заместитель председателя Совета Республики, национальный координатор по достижению Целей устойчивого развития Марианна ЩЕТКИНА** отметила, что сегодня выстраивается стратегия развития регионов. По ее словам, Брестчина демонстрирует лидерство в вопросах устойчивого развития, потому Брест и был выбран адресом первого семинара.

**Заместитель председателя Брестского горисполкома Николай ЯКУБОВСКИЙ** презентовал масштабный проект «Брест. Симбиосити». В следующем году областной центр отметит юбилей, для этого много делается. Но и потом город продолжит развиваться по многим направлениям, чтобы в перспективе стать компактным, зеленым и «умным», а также удобным для жителей. Многие проекты на этом пути уже реализованы. В планах — «умная» городская инфраструктура, например светофоры, которые будут регулировать движение, расставляя приоритеты.

Отмечалось, что по итогам встреч в регионах в январе пройдет республиканский форум по устойчивому развитию.

**Владислав ЛУКАШЕВИЧ.**
**Светлана ЯСКЕВИЧ.**

# ДЛЯ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ НАЛОГОВОЙ СИСТЕМЫ

**Совещание по вопросам выполнения поручений главы государства по доработке проекта новой редакции Налогового кодекса Республики Беларусь прошло в Совете Республики Национального собрания Республики Беларусь в среду, 28 ноября, под руководством председателя Совета Республики Михаила МЯСНИКОВИЧА.**

Как сообщается на сайте верхней палаты белорусского парламента, в совещании принял участие первый заместитель премьер-министра Александр Турчин. Участники совещания рассмотрели спорные положения проекта, приняли к сведению замечания Администрации Президента.

Создана рабочая группа, которая будет заниматься доработкой новой редакции Налогового кодекса. Ее возглавил председатель Совета Республики Михаил Мясникович. Заместителем руководителя рабочей группы стал Александр Турчин.

Ранее над изменениями и дополнениями в Налоговый кодекс работали две рабочие группы — межведомственная при Министерстве финансов и постоянно действующая при Совете Министров. Новой рабочей группе предстоит еще раз проанализировать подготовленную редакцию кодекса, обсудить спорные моменты и выработать по ним единое мнение, отметил Михаил Мясникович. При этом главное требование к документу остается неизменным: налоговая система должна быть прозрачной, более простой и понятной для людей и бизнеса.

С учетом поставленной Президентом задачи доработать документ в течение двух недель, проект новой редакции Налогового кодекса должен поступить на рассмотрение в Палату представителей Национального собрания до 7 декабря.

ЧТО В РАБОТЕ?

# В ЖИЛИЩНОМ КОДЕКСЕ НЕТ МЕЛОЧЕЙ

**В прошлый четверг состоялось расширенное совещание, на котором специалисты детально рассмотрели проект закона «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам правового регулирования жилищных отношений», где обсуждался проект новой редакции Жилищного кодекса.**



sovrep.gov.by

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр ПОПКОВ** на совещании отметил, что при подготовке законопроектов необходимо исходить из реальных проблем, которые существуют в обществе. Он заявил, что, несмотря на то, что действующий Жилищный кодекс был принят всего шесть лет тому назад — в 2012 году, — жилищное законодательство претерпело существенные изменения, которые в целях оперативности претворялись в жизнь путем принятия актов главы государства. За время своего действия они показали свою эффективность. Таким образом, новая редакция Жилищного кодекса не содержит революционных изменений в жилищной сфере, а лишь на плановой основе систематизирует в едином документе нормативные предписания, принятые за последние годы.

Александр Попков отметил, что при подготовке законопроектов нужно работать на длительную перспективу, недопустимо часто вносить изменения в нормативные документы. Именно на предварительной стадии, когда формируется концепция того или иного законодательного акта, стоит учитывать реальные проблемы, которые существуют в обществе. Каждый законодательный акт должен быть осмыслен. Сенатор уверен, что для этого нужно напрямую разговаривать с народом, видеть и слышать то, что его волнует.

При обсуждении новой редакции Жилищного кодекса много внимания было уделено вопросам, связанным с деятельностью товариществ собственников (ТС) и организаций застройщиков. **Председатель правления ТС и ЖСПК из Гродно Андрей БОРКО** считает, что кодекс обязан предусмотреть ту модель, которая будет актуальной завтра. Он уверен, что нужно пересмотреть кворум для принятия решения о создании товарищества собственников. Для кворума должно быть не две третьих, как предлагается сейчас, а 50 % плюс один голос. Люди пожелали сделать товарищество собственников и собираются самостоятельно распоряжаться общими деньгами для наведения порядка в своем доме. Надо дать им такую возможность, даже если их всего лишь большинство среди жильцов дома, считает Андрей Борко. В то же время специалист уверен, что необходимо уже сейчас предусмотреть процедуру выхода одного из домов из многодомовых товариществ.

**Председатель правления Ассоциации ТС и ЖСПК «Гомельский собственник» Тамара ЯКУБОВА** обратила внимание на необходимость еще раз проанализировать вопрос возмещения затрат, связанных с потреблением электроэнергии, расходуемой на работу лифтов.

Она также подняла вопрос платы за обслуживание домофона, систем видеонаблюдения. «Сталкиваемся с тем, что жилец говорит: «У меня нет договора на домофон, я не буду за него платить». Если имущество находится на балансе, это часть общего совместного имущества, соответственно, это не дополнительная услуга. И вопрос, платить или не платить, заключать договор или не заключать, не должен стоять», — убеждена Тамара Якубова. Аналогично с системами видеонаблюдения: если она приобретена и установлена по решению общего собрания, это является не дополнительной услугой, а общим имуществом, которое приобретено в интересах всех жильцов. Соответственно, необходимо нести расходы, связанные с содержанием этого имущества, подчеркнула она.

> «При подготовке законопроектов нужно работать на длительную перспективу, недопустимо часто вносить изменения в нормативные документы. Именно на предварительной стадии, когда формируется концепция того или иного законодательного акта, стоит учитывать реальные проблемы, которые существуют в обществе.

Стоит отметить, что на совещании в Совете Республики приняли участие 25 специалистов министерств жилищно-коммунального хозяйства, финансов, архитектуры и строительства, по чрезвычайным ситуациям и других заинтересованных ведомств и институтов.

Что касается проекта новой редакции Жилищного кодекса, **заместитель председателя Постоянной комиссии Палаты представителей по жилищной политике и строительству Оксана ГАЙДУК** сообщила, что он согласован практически без замечаний областными исполнительными комитетами, Верховным судом, Генеральной прокуратурой, Национальным банком, Следственным комитетом и Национальной академией наук.

**Сергей КУРКАЧ.**

# РАЗВЯЗЫВАНИЕ УЗЛОВ

**В Москве с участием белорусских и российских сенаторов эксперты двух стран обсуждали проблемы Союзного государства и предлагали пути их решения.**

В Институте Европы Российской академии наук впервые прошло совместное заседание Интеграционного клуба при председателе Совета Федерации Федерального собрания России и Российско-белорусского экспертного клуба. Заседание проводилось во исполнение рекомендаций по расширению научно-экспертного взаимодействия между двумя странами, которые содержатся в итоговом документе V Форума регионов Беларуси и России.

**Директор Института Европы РАН Алексей ГРОМЫКО,** выступивший модератором дискуссии, сообщил, что итоговый документ совместной работы белорусских и российских интеллектуалов будет направлен в верхние палаты парламентов двух стран.

**Заместитель председателя Совета Федерации Ильяс УМАХАНОВ** рассказал, что Интеграционный клуб при председателе Совета Федерации, который был создан по инициативе Евгения Примакова и действует уже шесть лет, задумывался как интеллектуальный центр, который вырабатывает идеи и рекомендации, касающиеся всех сфер интеграции. Рекомендации и предложения, содержащиеся в ежегодном докладе Интеграционного клуба, направляются в правительство Российской Федерации, профильные министерства и ведомства, руководителям регионов.

«С какого-то времени мы пошли по пути привлечения в рамках евразийского интеграционного процесса и представителей зарубежных стран. У нас были такие контакты с коллегами из Армении, Казахстана. Но первое совместное заседание проводим именно с нашими белорусскими друзьями, — подчеркнул вице-спикер верхней палаты российского парламента. — Мы рассматриваем его как старт взаимодействия по выработке стратегии развития евразийского экономического сотрудничества, учитывая опыт, возможности и сценарии».

Практическое значение совместной работы белорусских и российских экспертов подчеркнул в своем выступлении и **председатель комиссии по международным делам и национальной безопасности Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Сергей РАХМАНОВ**. «Одним из ключевых вопросов, которые надо решать, причем форсировано, это развитие нашей производственной базы. Сейчас одна из самых серьезнейших проблем в рамках Союзного государства — уровень развития экономики, в первую очередь в сфере высоких технологий, — сказал он. — Мы должны выработать такие схемы, которые позволили бы нам реально взаимодействовать».

Для выработки совместных решений, которые помогут создать на территории двух стран тысячи высокотехнологичных предприятий, Сергей Рахманов предложил привлекать не только ученых, экспертов, но и представителей бизнеса. Он также выразил пожелание создать потоянно действующую ассоциацию аналитических центров России и Беларуси.

Инициативу парламентариев и их роль в развитии отношений между Беларусью и Россией отметил **государственный секретарь Союзного государства Григорий РАПОТА.** Он призвал также законодателей активнее подключаться к экспертным оценкам основных готовящихся в рамках Союзного государства документов. «Мне бы очень хотелось, чтобы вы высказали свои суждения по такому программному документу как Приоритетные направления развития Союзного государства, который обновляется каждые четыре года, — привел пример госсекретарь. — Любые ваши пожелания будут обязательно учтены».

Среди проблем Григорий Рапота назвал оторванность идеи строительства Союзного государства от жизни и упущение в задумываемых совместных проектах элемента, который действительно связывает две страны. В этом контексте он напомнил о конкуренции транспортных путей, соединяющих Европу и Китай в рамках проекта «Один пояс — один путь». «Если мы не создадим нечто более выгодное для этих двух мощных торгово-экономических партнеров, то надо забыть о нашем участии в экономическом Шелковом пути», — подчеркнул госсекретарь.

Образцовыми и беспрецедентными назвал отношения между Беларусью и Россией **председатель Комитета Совета Федерации по международным делам Константин КОСАЧЕВ.** «Это колоссальный потенциал, огромная работа, и об этом надо совершенно четко говорить», — убежден сенатор. Однако проект Союзного государства — это нечто иное, и за два десятилетия он реализован не в том объеме, в каком его задумывали авторы, заметил он.

Константин Косачев предложил еще раз проанализировать текст союзного договора, подвергнув тщательному анализу все то, что пока не удалось завершить, и, пересмотрев пункты, по которым стороны, учитывая преждевременность или изменившиеся обстоятельства, не собираются идти до конца.




С российским коллегой не согласился **заместитель председателя Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси Геннадий ДАВЫДЬКО.** «Союзное строительство уникальное тем, что нам важен не результат, а процесс, — считает белорусский сенатор. — Строительство как политический аргумент в нашей современной совместной борьбе важнее, чем стремление скорее построить. Если мы начнем сейчас форсировать вопросы парламента, эмиссионного центра, союзной собственности, то мы все поломаем».

Отдельное внимание в процесе союзного строительства, по мнению Геннадия Давыдько, необходимо уделить информационной сфере. «Я считаю, что на сегодняшний день очень важно усиливать пропаганду идей Союзного государства», — сказал он, назвав среди мер расширение телевизионного присутствия канала БелРос до максимально возможного на территории Беларуси и России.

Участники заседания обсудили также роль Союзного государства в других интеграционных процессах, внешние и внутренние вызовы объединения, роль предпринимательства в экономике союза и результаты социологических исследований на данную тему. Кроме сенаторов двух стран и представителей Постоянного комитета Союзного государства в заседании клуба приняли участие представители министерств иностранных дел, органов государственной власти, научно-экспертных, образовательных, общественных организаций и деловых кругов Беларуси и России.

**Ольга МЕДВЕДЕВА,**
*г. Москва.*




СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Зацікаўленасць з абодвух бакоў

**На мінулым тыдні адбыўся візіт у Германію дэлегацыі рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам ФРГ.**


sovrep.gov.by

Па запрашэнні германска-беларускай парламенцкай групы Бундэстага з 20 па 23 лістапада рабочая група па супрацоўніцтве з парламентам ФРГ, якую ўзначаліў яе кіраўнік, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Ігар Жук, наведала Германію.

У склад беларускай дэлегацыі таксама ўвайшла намеснік кіраўніка рабочай групы, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна Кананчук. Адзначым, што гэта першы візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі за апошнія гады. У рамках яго беларускія парламентарыі сустрэліся з віцэ-прэзідэнтам Бундэстага ФРГ Петрай Пау. Адбыўся зацікаўлены абмен меркаваннямі па шырокім спектры пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва і магчымых фарматах далейшага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння з членамі германска-беларускай парламенцкай групы.

Між іншым, падчас візіту ў цэнтры ўвагі беларускай парламенцкай дэлегацыі знаходзіліся і іншыя тэмы. Напрыклад, пытанні супрацоўніцтва ў сферах сельскай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага развіцця абмяркоўваліся на сустрэчах з кіраўніцтвам і членамі камітэтаў Бундэстага па сельскай гаспадарцы і харчаванні, а таксама па навакольным асяроддзі, ахове прыроды і бяспецы ядзерных рэактараў.

Члены беларускай парламенцкай дэлегацыі правялі таксама сустрэчы ў Бундэсраце, ведамстве федэральнага канцлера і Федэральным міністэрстве замежных спраў ФРГ. З парламенцкім дзяржсакратаром Федэральнага міністэрства ўнутраных спраў Штэфанам Маерам дэталёва абмеркавалі пытанні процідзеяння тэрарызму і нелегальнай міграцыі.

Як паведаміў Ігар Жук, і ў Бундэстагу, і ў Бундэсраце, міністэрстве замежных спраў, на іншых сустрэчах цёпла ставіліся да беларускай дэлегацыі і адзначалі істотную ролю ў міжнароднай палітыцы, якую сёння адыгрывае Беларусь. Мінск, які стаў міратворчай пляцоўкай для ўрэгулявання канфлікту на Украіне, дзе прайшла Мюнхенская канфэрэнцыя па бяспецы, безумоўна, прыцягвае ўвагу міжнароднай грамадскасці.

— На ўсіх сустрэчах адначалася, што Беларусь праводзіць дружалюбную палітыку, не вылучаючы кагосьці асобна. Безумоўна, у нас ёсць стратэгічны партнёр — Расія, аднак наша шматвектарная палітыка, накіраваная на развіццё гандлёвых, эканамічных, культурных, гуманітарных адносін з краінамі Еўразаюза, у тым ліку Германіяй, не застаецца па-за ўвагай, — адзначыў суразмоўнік.

Што датычыцца міжпарламенцкіх адносін, па словах Ігара Жука, парламентарыі Германіі зацікаўленыя ў наладжванні стабільных кантактаў з беларускімі калегамі. Са свайго боку, старшыня рабочай групы па супрацоўніцтве з парламентам ФРГ запрасіў нямецкіх парламентарыяў бліжэй пазнаёміцца з вопытам работы органаў мясцовага самакіравання ў Беларусі.

У рамках візіту беларуская парламенцкая дэлегацыя таксама наведала федэральную зямлю Цюрынгія, дзе прайшлі перагаворы з кіраўніком па старшынстве Цюрынгскага ландтага Эльке Хольцапфель і азнаямленне з сістэмай абарачэння тары ў Германіі.

Падчас сустрэчы была дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб заключэнні дагавора аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім абласным Саветам дэпутатаў і ландтагам Цюрынгіі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

МЕРКАВАННІ

**Кацярына ЗЕНКЕВІЧ, старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў:**



— Па змесце ўтвораныя асацыяцыі не павінны ператварацца ў фармальныя справаздачы тэрыторый. Наконт вырашэння пэўных праблем на месцах павінен выбудоўвацца дыялог: паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь, мясцовымі Саветамі дэпутатаў і органамі тэрытарыяльнага самакіравання. Зразумела, ён павінен ісці праз прызму праваўжывальнай практыкі нацыянальнага заканадаўства і з улікам меркаванняў мясцовых органаў улады.

Асацыяцыі могуць узяць на сябе пытанні абагульнення прапаноў з месцаў па ўдасканаленні нарматыўна-прававой базы і адміністрацыйных працэдур, эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў і іншыя пытанні, якія непасрэдна ўплываюць на ўзровень і якасць жыцця людзей.

Праз асацыяцыі можа быць арганізавана публічнае абмеркаванне законапраектаў, што неадназначна прапаноўваў кіраўнік дзяржавы. Асацыяцыі могуць стаць пляцоўкай для гутаркі з грамадствам, у тым ліку з усімі зацікаўленымі грамадскімі арганізацыямі і аб'яднаннямі.

**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**



— Дзеля чаго створана асацыяцыя? Перш за ўсё, дзеля аказання метадычнай дапамогі на месцах, як калегіяльны орган прадстаўнічай улады. Адзін з прыярытэтных кірункаў у рабоце — удзел у праектах міжнароднай тэхнічнай дапамогі, усталяванне кантактаў з міжнароднымі фондамі, асацыяцыямі, арганізацыямі на мясцовым узроўні. Наша задача — зрабіць камфортным жыццё людзей, дзе б яны ні жылі, а яшчэ актывізаваць іх да грамадскага ўдзелу і рэалізацыі ініцыятыў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў іх жыцця. А асацыяцыя, са свайго боку, змагла б маральна і матэрыяльна падтрымаць на законным узроўні.

**Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў:**



— На нарадзе ў Савеце Рэспублікі сярод іншых уважліва слухаў пра вопыт Магілёўскай і Гродзенскай абласцей па тэме дзейнасці асацыяцый мясцовых Саветаў. У мерапрыемстве, дарэчы, бралі ўдзел і прадстаўнікі Еўрапейскага саюза.

Тое, што пачуў, зацікавіла. Магчыма, з часам створым аналагічную асацыяцыю. Думаю, у выніку можна будзе больш эфектыўна вырашаць праблемы выбаршчыкаў, зрабіць яшчэ больш цесным узаемадзеянне з органамі выканаўчай улады.

І паралельна можна пераймаць перадавы вопыт мясцовага самакіравання.

З ВОПЫТУ РАБОТЫ

# З выхадам на міжнародны ўзровень

## Гродзенская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў пашырае сферу інтарэсаў

**Тры часоў, як у рэгіёне з'явілася асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, прайшло тры гады. Пра тое, што атрымалася зрабіць за гэты перыяд «МС» пацікавілася ў яе старшыні — Анатоля НІКІЦІНА.**



Трэба сказаць, што ў дэпутацкім корпусе Гродзеншчыны фігура генерала Анатоля Нікіціна мае вагу перш за ўсё дзякуючы аўтарытэту і прафесійнаму досведу: Анатоль Аляксеевіч раней займаў пасаду старшыні гарадскога Савета дэпутатаў. Не пачатковец на ніве прадстаўнічай улады, а сапраўдны аксакал, які ў мясцовым самакіраванні пуд солі з'еў. З пытання аб тым, з чаго пачыналася гродзенская асацыяцыя, мы і пачалі нашу гутарку:

— У лістападзе 2015 года быў зацверджаны Статут Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, куды ўвайшлі абласны, гарадскі, 11 раённых і 38 сельскіх Саветаў. Па колькасным складзе — 425 дэпутатаў. Кіраўніцтва дзейнасцю асацыяцыі ажыццяўляе праўленне, членамі якога з'яўляюцца сем Саветаў дэпутатаў (абласны, гарадскі і пяць раённых).

**— Анатоль Аляксеевіч, наколькі я разумею, стварэнне рэгіянальнай асацыяцыі — справа не аднаго дня?**

— Так, на працягу двух месяцаў дэпутатамі Саветаў Гродзенскай вобласці абмяркоўваўся Статут асацыяцыі, уносіліся змены, дапаўненні, прапановы на сесіях, пасяджэннях прэзідыумаў, так і ў індывідуальным парадку. Галоўным прадметам дзейнасці асацыяцыі з'яўляецца актыўнае садзейнічанне станаўленню і развіццю мясцовага самакіравання. Калі больш дэталёва, то мы працуем па розных напрамках: ад арганізацыі вучобы і абмену вопытам да міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы мясцовага кіравання і самакіравання.

**— А вось тут хацелася б падрабязней...**

— Што датычыцца першага напрамку работы — вучобы і абмену вопытам, — мы праводзім сумесныя пасяджэнні з прэзідыумам абласнога Савета дэпутатаў, семінары з выездам на месцы, а таксама па абмене вопытам з магілёўскімі калегамі на сумесным пасяджэнні з іх рэгіянальнай асацыяцыяй (сёння ў краіне асацыяцыі функцыянуюць толькі ў двух рэгіёнах. — **Заўв. аўт.**). Вучобу лічым вельмі важным складнікам сваёй працы, паколькі дэпутат — гэта звычайны чалавек, толькі больш актыўны. І ад таго, наколькі ён будзе больш дасведчаны ў тэме механізмаў вырашэння тых ці іншых пытанняў, залежыць выніковасць яго працы. Напрыклад, у 2016 годзе ў Наваградку расказвалі аб магчымасцях удзелу органаў мясцовага самакіравання Гродзенскай вобласці ў праектах трансгранічнага супрацоўніцтва ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні», а таксама аб рабоце органаў тэрытарыяльнага самакіравання і мерах па далейшым павышэнні эфектыўнасці іх дзейнасці ў Гродне, а таксама мерах, якія прымаюцца мясцовымі ўладамі па павышэнні ўзроўню добраўпарадкаванасці аграгарадкоў і іншых перспектыўных для сацыяльна-эканамічнага развіцця населеных пунктаў да 2020 года.

У 2017-м разглядалі работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання Шчучынскага раёна па ўключэнні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая знаходзіцца ў камунальнай уласнасці і выкарыстоўваецца неэфектыўна, для далейшага развіцця падведамаснай тэрыторыі, а ў Слонімскім раёне — далейшую актывізацыю работы органаў мясцовага кіравання па стварэнні ўмоў для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і павышэння інвестыцыйнай прывабнасці рэгіёна. Сёлета акцэнтавалі ўвагу спецыялістаў раённых Саветаў дэпутатаў і ў Гродне на асаблівасцях афармлення дакументаў і дагавораў у рамках трансгранічнага супрацоўніцтва.

Акрамя таго, асацыяцыя з'яўляецца акумулятарам вопыту і ведаў. Зараз, напрыклад, мы збіраем, вывучаем і аналізуем пытанні арганізацыі і ажыццяўлення мясцовага самакіравання, хутка будзе надрукаваны метадычны дапаможнік, які мы падрыхтавалі для старшыняў КТОСаў «Развіццё мясцовага самакіравання ў Гродзенскай вобласці», дзе сабралі ўсе дакументы, неабходныя ім для працы.

Другі напрамак дзейнасці датычыцца арганізацыі і правядзення конкурсаў. Штогод мы вызначаем найлепшага старасту вёскі і найлепшыя КТОС і сельскі Савет. Для гэтага распрацавалі граматы і ўручаем карысныя прызы. Напрыклад, летась у конкурсе ўдзельнічалі 38 сельсаветаў, 54 старасты, 22 КТОСы Гродзеншчыны — членаў асацыяцыі.

**— Што маецца на ўвазе пад карыснымі прызамі, калі гэта не сакрэт?**

— Мы пацікавіліся ў пераможцаў, што неабходна ім для працы: большасць наракала на недахоп сродкаў для пакосу травы — вырашылі падарыць газонакасілкі: для сельсавета гэта адна з самых патрэбных рэчаў.

**— Добра, але не толькі ж вучобай і конкурсамі жыве асацыяцыя, чым займаецца акрамя гэтага?**

— Яшчэ адным важным напрамкам дзейнасці з'яўляецца міжнароднае супрацоўніцтва.

У 2016 годзе сумесна з прадстаўнікамі васьмі былых рэспублік Савецкага Саюза (Расіі, Украіны, Арменіі, Кыргызстана, Казахстана, Азербайджана, Літвы, Латвіі) быў закладзены ў Каложскім парку «Парк Дружбы народаў», а ў працяг гэтай акцыі — у маі мінулага года тут жа пачаўся міжнародны праект «Бэз Перамогі» пры непасрэдным удзеле асацыяцыі дэпутатаў. У нас наладжаны дзелавыя сувязі з асацыяцыямі Расіі, Арменіі, Украіны, Польшчы, Латвіі, Грузіі, Італіі. Гэтым мы не абмяжоўваемся: сумесна з асветніцкім грамадскім аб'яднаннем «Фонд імя Льва Сапегі» вядзём актыўную работу па пошуку калег і партнёраў у краінах Еўропы. Дарэчы, Гродзенская абласная асацыяцыя зарэгістраваная ў сістэме PADOR Еўрапейскай камісіі для таго, каб мець магчымасць удзельнічаць у рэалізацыі трансгранічных праектаў.

**— І ўжо ёсць канкрэтныя вынікі?**

— Нават адмоўны — і той вынік. (*Усміхаецца.*) Сумесна з фондам Льва Сапегі былі распрацаваны дакументы па ўдзеле ў рэалізацыі праекта на суму ў 200 тысяч еўра. Але мы атрымалі нізкія балы ад партнёраў і не прайшлі ў наступны этап конкурсу па прычыне непрызнання Беларуссю Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання. Праўда, першая няўдача не астудзіла наш запал, у наступным годзе мы працягнем прыкладаць намаганні па дасягненні пастаўленай перад сабой мэты.

У штаце Асацыяцыі ў якасці намесніка старшыні працуе дэпутат гарадскога Савета Сяргей Каляда, багаж удзелу якога ў праектах трансгранічнага супрацоўніцтва досыць вялікі, таму разлічваем на поспех. Зараз дзякуючы яго ўдзелу асацыяцыяй распрацавана пяць праектаў па трансгранічным супрацоўніцтве, якія ахопліваюць тэрыторыі ад невялікіх сельскіх Саветаў (што важна ў Год малой радзімы) да знакавых аб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі турысцка-рэкрэацыйнага парку «Аўгустоўскі канал».

Акрамя таго, мы звяртаем увагу не толькі на заходнік донараў, але працуем і з усходнім партнёрам: цяпер у стадыі рашэння знаходзіцца праект аднаўлення помнікаў героям вайны 1812 года — генералам Ланскому (пахаванне ў Гродне) і Гамперу (у аграгарадку Дзярэчын Зэльвенскага раёна) сумесна з маскоўскай установай «Музей-панарама «Барадзінская бітва». Усе дакументы і інфармацыйныя матэрыялы разглядаюцца ў Пастаянным камітэце Саюзнай дзяржавы ў дзяржсакратара Рыгора Рапоты, а таксама ў Музеі-панараме «Барадзінская бітва».

Калі гаварыць далей аб міжнародным складніку, то мы па даручэнні старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова зараз вывучаем вопыт працы нашых суседзяў — палякаў — па рэалізацыі ініцыятыў на мясцовым узроўні.

**— Наколькі разумею, ініцыятыва асацыяцыі, якая датычыцца аднаўлення помнікаў, акрамя міжнароднага складніка з вашага боку мае дачыненне да апякунскай дзейнасці?**

— Так, гэты кірунак працы (апякунская і гуманітарная дзейнасць. — **Заўв. аўт.**) таксама знаходзіцца ў полі зроку асацыяцыі: мы прымаем удзел у акцыях па аднаўленні помнікаў воінам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выдзяляючы на гэта сродкі з членскіх узносаў і спонсарскай дапамогі. Асацыяцыя непасрэдна ўдзельнічала ў аднаўленні Кургана Славы ў Гродне і стварэнні мяжы імя Дзмітрыя Карбышава не толькі матэрыяльна, але і, можна сказаць, фізічна. Акрамя таго, асацыяцыя ўзяла шэфства над такімі абласнымі ўстановамі, як кадэцкае вучылішча, Дом малюткі, цэнтр рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў.

На Каляды і навагоднія святы ўсім падшэфным арганізацыям уручаем патрэбныя ім падарункі: спортінвентар, аргтэхніку, цацкі, адзенне і прысмакі для дзяцей. Ця перашнія святы не стануць выключэннем: добрыя пачынанні павінны працягвацца і памнажацца.

**Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.**

А ЯК У ІХ?

**СІСТЭМА мясцовага самакіравання ў замежных краінах звычайна грунтуецца на адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле. Пярвічнай ячэйкай мясцовага самакіравання выступаюць звычайна гарадскія і сельскія мясцовыя супольнасці — грамады (камуны), якія могуць значна адрозніваца адна ад адной памерамі тэрыторый і колькасцю насельніцтва. Заканадаўства замежных краін аб мясцовым самакіраванні не выключае магчымасць аб'яднання камун і стварэння іх асацыяцый.**

Напрыклад, у Іспаніі існуе такая форма, як сіндыкаты — добраахвотныя аб'яднанні камун, створаныя дзеля сумеснага выканання пэўных работ, якія адносяцца да іх кампетэнцыі.

У ЗША у межах асобных штатаў ёсць разнастайныя арганізацыі, якія падтрымліваюць цесныя сувязі з органамі ўлады штатаў, лабіруюць у іх свае інтарэсы. Такія ж працэсы адбываюцца і на федэральным узроўні, хоць тут такіх муніцыпальных лабісцкіх арганізацый менш, чым у штатах. Найбольш значнай з'яўляецца Нацыянальная ліга гарадоў, галоўная задача якой — лабіраванне інтарэсаў гарадоў у Кангрэсе ЗША і федэральным урадзе. Нацыянальная ліга гарадоў аб'ядноўвае ўсе сталіцы штатаў, найбольш буйныя гарады і гарадскія агламерацыі, згодныя плаціць членскія ўзносы. У кожным штаце ёсць свая ліга, так што буйны горад можа ўваходзіць і ў яе, і ў Нацыянальную лігу. У ЗША штогод праводзіцца Кангрэс гарадоў ЗША, які звычайна збірае прадстаўнікоў з 7-10 тысяч гарадоў.

У Вялікабрытаніі існуюць асацыяцыі графскіх, акружных і нізавых (вясковых, парафіяльных, камунальных) звёнаў муніцыпальнай сістэмы. Яны звычайна дзейнічаюць самастойна, падтрымліваючы сувязі з міністрамі і ўрадам.

У Шатландыі дзейнічае адзіная арганізацыя муніцыпальных улад — Convention of Scottish Local Authorities (COSLA), з дапамогай якой міністр па справах Шатландыі размяркоўвае дзяржаўныя субсідыі, выдзеленыя парламентам мясцоваму самакіраванню гэтага рэгіёна Злучанага Каралеўства.

## Тэлесеткі

# «ПЕСНЯ ГОДА БЕЛАРУСІ» ФІНІШУЕ Ў СНЕЖНІ



Кожны ўдзельнік атрымлівае памятны дыплом фестывалю.

У тэлевізійным канцэрце «Песня года Беларусі — 2018», па традыцыі складзеным з песень айчынных выканаўцаў, якія цягам усяго года найчасцей гучалі ў радыёэфіры і з'яўляліся лідарамі рата-цыі, упершыню возьмуць удзел вядомыя дыджэі з вядучых радыёстанцый нашай краіны. 7 снежня ў Палацы Рэспублікі яны стануць сувядучымі канцэрта і будуць працаваць з артыстамі ў закуліссі. Тэлеверсію «Песні года Беларусі» канал АНТ прапануе гледачам 25 снежня.

У спісе ўдзельнікаў — каля 30 артыстаў і калектываў, сярод якіх NaviBand і «Без Білета», Іна Афанасьева і Алена Ланская, Ларыса Грыбалёва, Аляксей Хлястоў, Тэа, Герман і многія іншыя. Спецыяльным госцем фестывалю стане расійскі спявак Аляксей Глызін.

Дарэчы, вялікі музычны фестываль пад назвай «Песня года Беларусі» ладзіцца ўжо 13 гадоў на буйных пляцоўках нашай краіны. Прычым праходзіць ён не толькі ў сталіцы: так, у 2016 і 2017 гадах зборныя канцэрты папулярных выканаўцаў праходзілі ў Маладзечне, сёлета — у Навапалацку.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**






# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 57

Прапануем задачу, якую склаў спецыяльна для нашай газеты Мікалай Быкаў з Баранавіцкага раёна *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Креб, Фf1, Ле2, Лf8, Cd3, Kg2, пп. f2, h3 (8).
**Чорныя:** Kpf3, Kd6, пп. d4, e3, e7, f5 (6).

Мат у 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У сёлетнім чэмпіянаце свету сярод жанчын у Ханты-Мансійску выступалі 64 удзельніцы. Прадстаўніц Беларусі сярод іх не было. Званне чэмпіёнкі заха-вала кітаянка Цзюй Вэньцзюнь. У фінале яна саступала расіянцы (да 2014 года — прадстаўніцы Украіны) Кацярыне Лагно — 1:2, але здолела зраўняць лік у чацвёртай партыі.

Кацярына Лагно — Цзюй Вэньцзюнь. 1.e4 c5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 g6 4.0-0 Cg7 5.Ле1 e5 6.a3 Kge7 7.Kc3 0-0 8.Cc4 d6 9.d3 h6 10.Kd5 Kph7 11.c3 f5 12.ef gf 13.b4 Kg6 14.b5 Ka5 15.Ca2 Ce6 16.Фa4 b6 17.Cd2 Лg8 18.Лad1 Фd7 19.Kh4 Ch8 20.K:g6 Л:g6 21.Фh4 Лag8 22.g3 Фf7 23.c4 Cf6 24.K:f6+ Л:f6 25.f4 Лg4 26.Фh3 Лfg6 27.Лf1 Фg7 28.Kph1 Cc8 29.Фh5 Cb7+ 30.Kpg1 Л:g3+ 31.hg Л:g3+ 32.Kpf2 Лg2+, 0:1.

Давялося гуляць дадатковыя партыі са скарочаным кантро-лем часу. Пасля двух нічых кітаянка выйграла дзве наступныя «хуткія» партыі. Прычым у апошняй з іх К. Лагно, так бы мовіць, на роўным месцы падставіла свайго ферзя пад удар варожага каня і тут жа здалася. Амаль трагічны фінал напружанага паядынку.

* * *

У гэтыя ж дні ў Лондане праходзіў матч за званне чэмпіёна свету сярод мужчын паміж нарвежцам Магнусам Карлсенам (дзеючым чэмпіёнам) і амерыканскім гросмайстрам італьянскага паходжання Фабіяна Каруанам. Пра яго вынікі раскажам у наступным выпуску.

* * *

У Іспаніі прайшлі чэмпіянаты свету сярод хлопчыкаў і дзяўчат так да 8, 10 і 12 гадоў. У сваіх групах найлепшы вынік з беларусаў паказалі Каця Зубкоўская і Дзяніс Лазавік (пятыя месцы), Арцём Бляўскі (шостае).

Мікіта Маёраў фінішаваў сёмы ў турніры на Фарэрскіх астравах.

* * *

У лістападзе споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння вядомага шахматнага майстра і трэнера Аляксея Сакольскага (1908—1969). Нарадзіўся Аляксей Паўлавіч у Пензенскай губерні, пасля вайны жыў у Львове, а з пачатку 50-х — у Мінску. Двухразовы чэмпіён Украінскай ССР, прызёр чэмпіянатаў РСФСР і БССР, заслужаны трэнер СССР, аўтар шэрагу цікавых кніг, нястомны папулярызатар шахмат у беларускіх перыядычных выданнях. Дэбют, які пачынаецца ходам 1.b4, атрымаў імя Сакольскага. Пасля смерці майстра ў Мінску доўгі час ладзіліся яго мемарыялы, адзін з якіх выйграў юны Гары Каспараў.

А. Сакольскі — А. Кофман (Кіеў, 1944). 1.d4 f5 2.e4!? fe 3.Kc3 Kf6 4.Cg5 b6 5.f3 Cb7 6.fe K:e4 7.K:e4 C:e4 8.Kf3 Фc8 9.Cd3 C:d3 10.Ф:d3 Фa6? 11.Фe4! Kc6 12.d5 Ka5 13.Ke5 d6? 14.Kf7! Kp:f7 (або 14...Лg8 15.Ф:h7 Kp:f7 16.Лf1+) 15.Лf1+ Kpe8 17.Л:f8+!, 1:0 (16... Kp:f8 17.Ф:e7+ Kpg8 18.Фe6+ Kpf8 19.Ce7+ з матам).

* * *

Рашэнні задач з мінулага выпуску: № 1. 1.Ke7. № 2. 1.Kpc1. № 3. 1.Лg4. Першымі правільна адказалі: Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# ШЛЯХ ДА МАРЫ



### «ДА ЧАГОСЬЦІ ЦУДОЎНАГА»

**TV1000, 3 снежня**

20-гадовая беспрацоўная Катарына жыве са сваім хлопцам у прыгарадзе Гётэбарга. У яе жыццёвым багажы — маці-алкагалічка і нясконачаная сярэдняя школа. Але аднойчы на YouTube ёй трапляецца фрагмент «Рэквіема» Моцарта, і дзяўчына разумее, што трэба мяняць свой лёс, «імкнуцца да чагосьці цудоўнага». Яна выдаляе сваю старонку ў сацыяльных сетках і ідзе ў канцэртную залу, каб паслухаць Моцарта ў выкананні аркестра...

### «ВЯСЁЛЫЯ РАБЯТЫ»

**«Беларусь 3», 7 снежня**



Музычная камедыя, знятая ў СССР у 1934-м, якая лічыцца цяпер класікай савецкай камедыі. Чаго вартыя хоць бы рэверансы рэжысёра ў бок Чарлі Чапліна, Гаральда Лойда і Бастэра Кітана, якія «ў карціне не ўдзельнічаюць». Затое ёсць просты хлопец Косця Пацехін, які пасе статак і марыць стаць артыстам, а таму спявае бадзёрыя песні. Аднойчы Косцю прымаюць за моднага заезджага гастралёра — і бярудь у мюзік-хол дырыжорам джаз-аркестра. Калектыў рыхтуецца да выступлення на вялікай сцэне і рэпеціруе... на пахаванні.




### «САЛОН ПРЫГАЖОСЦІ»

**МІР, 9 снежня**

Джына Норыс перавязджае з Чыкага ў Атланту, каб яе дачка змагла вучыцца ў прэстыжнай музычнай школе, і ўладкоўваецца працаваць у шыкоўны салон прыгажосці. Аднак калі кліенты ацэньваюць майстэрства новай цырульніцы, бос прысвойвае сабе ўсе заслугі, і жанчына вырашае адкрыць уласную майстэрню. Праўда, пераварыць не давядзецца з занядбанай цырульні, але Джына гатовая да любых цяжкасцяў.

### ФІНАЛЬНАЕ ШОУ «МІС СВЕТУ — 2018»

**АНТ, 8 снежня**



Мінчанка Марыя Васілевіч у ліку 118 прыгажунь з усёй планеты ўдзельнічае ў конкурсе «Міс свету», які праходзіць на кітайскім курорце Санья на востраве Хайнань. Дзяўчаты прайшлі шэраг адборачных этапаў (прыкладам, беларуска трапіла ў топ-30 на конкурсе «Міс топ-мадэль»), паўдзельнічалі ў культурных, спартыўных і сацыяльных мерапрыемствах, прадставілі свае дабрачынныя праекты, выступілі ў інтэлектуальным раўндзе. А ўжо ў наступную суботу нехта з іх атрымае карону з рук «Міс свету — 2017» Мануны Чхілар з Індыі. Пра фінальнае шоу вядома, што яно пройдзе без дэфіле ў бікіні, але будзе доўжыцца на 30 хвілін больш, чым у папярэднія гады.



### «КАХАННЕ ПРЭТ-А-ПАРТЭ»

**TV1000Ru, 8 і 9 снежня**

Жыў-быў палкі рымскі лавелас Джорджыа, якога за паталагічную хлусліваць бацька пазбавіў фінансаў, і ён вымушаны быў уладкавацца на працу ў Дом мод. Жыла-была маскоўская прыгажуня Вольга, якая прыехала ў Італію, каб знайсці каларытнае «аблічча» для рэкламнай кампаніі. І цяпер першы гатовы на ўсё, каб заваяваць другую — але ці атрымаецца гэта зрабіць у абставінах, калі клубок падману заблытваецца ўсё больш?




# Такі лямант, што сам не свой

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек.**

**Ну а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**га́ньба** — становішча, якое выклікае асуджэнне;

**ва́пна** — рэчыва белага колеру (вапна);

**бяро́мя** — ахапак дроў ці саломы;

**ля́мант** — моцны працяглы плач;

**кужаль** — валакно ачэсанага лёну;

**атрута** — ядавітае рэчыва;

**дзірка ад абаранка** — зусім нічога. (беларусы яшчэ скажуць: *ні шыша, ні сінь-пораху*; руская: *дырка от бублика, шиш с маслом*);

**як сам не свой** — моцна расхваляваны, у стане разгубленасці, роспачы, адчаю (беларускія сінонімы: *як цень, як у ваду апушчаны*; руская адпаведнікі: *не в себе, сам не свой*).

**Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у раніш-нім эфіры «Беларусь 3» кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.05** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Забудзь і ўспомні» (16+).**
**20.05** «Вячэрнія мелодыі». 1984 год (12+).
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Падольскі рок-фестываль». 2005 год (18+).

## EuroSport 1

**1.30, 5.00, 9.00, 12.30, 15.00, 18.15, 21.45** Снукер. UK Championship.
**2.35, 6.30** Біятлон. Кубак свету.
**3.30** Watts.
**4.30** Дзюдо. «Вялікі Шлем».
**8.00, 14.00, 19.45** Алімпійскія гульні. «Зала славы».
**10.30, 19.15** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй».
**11.00** Аўтаспорт. Серыя WTCC.
**11.30** Дроны. DR1 Champions.
**20.45** Шахматы. Матч за званне чэмпіёна свету.

## Кінакамедыя

**1.10** Адпеты мача (16+).
**2.45** Усе пары робяць гэта (16+).
**4.35** Supeрнянь (16+).
**6.15** Піўная ліга (16+).
**7.55** Даю год (16+).
**9.45** Чатыры пакоі (18+).
**11.40** Любоў-моркаў (12+).
**13.50** Любоў-моркаў-2 (12+).
**15.40** Любоў-моркаў-3 (12+).
**17.35** Без пачуццяў (16+).
**19.30** Паспець за 30 хвілін (16+).



**21.05** 100 мільёнаў еўра (16+).
**22.55** Адпеты мача (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.00** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.35** «Доктар І...» (16+).
**8.05, 19.00, 2.40** «Асколкі». Серыял (16+).
**9.40, 23.40** «Улегцы» (12+).
**10.15, 4.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.00, 17.40** «Варажбітка» (12+).
**13.10, 16.35** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.10** «Адкрыта» з Аксанай Байрак (16+).
**15.05** «Простыя складанасці» (12+).
**15.40** «Натуральны адбор» (12+).
**20.50** «Нераскрыты талент-3». Серыял (16+).
**21.55** «Знак якасці» (16+).
**22.50** «Савецкія мафіі» (16+).
**0.10** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.55** «Ультыматум Борна». Баявік (16+).



**5.35** «Лінія абароны» (16+).

## ТБ1000

**6.10, 17.30** Маска Зора (12+).
**8.50** Мільянер з трушчоб (12+).
**11.15** 1 + 1 (16+).
**13.30** Рок Дог (6+).
**15.30** Ва ўцёках (16+).
**20.10** Апошняе каханне на Зямлі (16+).
**22.05** Ілюзія падману (12+).
**0.20** Сёстры Магдаліны (16+).
**2.35** О, дзе ж ты, брат? (16+).
**4.30** Стой! Або мая мама будзе страляць (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Кур'ер з «Раю» (12+).
**8.20** На кручку! (16+).
**10.15** Бяжы! 2-я серыя (16+).
**12.15** Марафон (12+).
**14.20** Падсадны (16+).
**16.20, 4.20** Пальчатка Аўроры (16+).
**18.10** Пра любоff (16+).
**20.20** Мой хлопец — анёл (16+).
**22.20** Івановы (12+).
**0.20** Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў (18+).
**2.20** Іронія кахання (16+).

## Discovery

**6.00, 5.35** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25** Панарама 360 (16+).
**7.10** Гульні розуму (16+).
**8.00, 3.10** Аўта-SOS (12+).
**9.30, 2.20** Дзікі тунец (16+).
**10.20** Неверагодны доктар Пол (16+).
**11.05** Год у адкрытым космасе (16+).
**11.50, 18.45** Ледзяная дарога (16+).
**12.35, 19.35** Востраў бунтароў (16+).
**13.20, 20.20** Сіла племені (16+).
**14.05, 21.10, 0.45** Марс (16+).
**14.55** Тэхаскі ўлоў (16+).
**15.40, 18.00, 22.00, 1.35, 4.45** Расследаванні авіякатастроф. (16+).
**22.45** Секунды да катастрофы (16+).
**23.10** Гарачыя граніцы (16+).
**23.55** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас (16+).
**4.00** Сапраўдны суперкар (16+).

## National Geographic

**8.00, 16.00, 22.00** Махінатары (12+).
**9.00, 17.00, 23.00, 4.40** Круты цюнінг (12+).
**10.00, 15.00, 21.00** Як гэта ўстроена? (12+).
**11.00, 20.00, 5.30** Багажныя войны (12+).
**12.00, 1.00, 6.20** Зброя па-амерыканску (16+).
**13.00** Гарады, якія тонуць (12+).
**14.00, 3.50** Небяспечная работа (16+).
**18.00, 0.00** Залатая ліхаманка (16+).
**19.00, 2.00, 7.10** Скрозь кратовую нару (12+).
**2.55** Будоўля на Алясцы (12+).

КРУГЛЫ СТОЛ



# Падняць аўтарытэт і знайсці сродкі

## Якія прыярытэты ставіць перад сабой Магілёўская асацыяцыя Саветаў дэпутатаў

**ТРЫ гады таму Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў аб'яднаўся з гарадскімі і раённымі Саветамі вобласці ў асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў. Яе мэта — каардынаваць працу дэпутатаў у прававой, арганізацыйнай, фінансава-эканамічнай дзейнасці, а таксама абагульніць дзеянні ў рашэнні сацыяльных і іншых праблем. Сёння народныя абраннікі дзеляцца сваімі меркаваннямі накont моцных і слабых бакоў гэтага ўтварэння.**

*— Наколькі прадукцыйны быў перыяд станаўлення, што зроблена, якія праблемы вырашаныя? — пацікавілася «МС» у дэпутатаў.*

**Аксана АГАРОДНІКАВА, старшыня Горацкага раённага Савета дэпутатаў, былы кіраўнік праўлення Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў:**



— За час існавання асацыяцыі мы правялі некалькі вельмі важных сустрэч і семінараў. Вывучалі вопыт рэалізацыі мясцовых ініцыятыў, добра адпрацаваны ў Слаўгарадскім, Краснапольскім, Чавускім раёнах, дзяліліся сваімі напрацоўкамі па рэалізацыі праекта «Горкі — здаровы горад», развівалі міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. За кошт добраахвотных узносаў дапамаглі шэрагу абласных і раённых сацыяльных устаноў. Арганізавалі шэфства над магілёўскім спецыялізаваным Домам дзіцяці, аказалі матэрыяльную дапамогу раённым бальніцам, цэнтрам карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі.

На жаль, не атрымалася задзейнічаць патэнцыял асацыяцыі ў рэалізацыі міжнародных праектаў, наладзіць стасункі з асацыяцыямі іншых краін у рамках праектаў трансгранічнага супрацоўніцтва, а таксама прыцягнуць інвестыцыі для вырашэння больш глабальных праблем у жыццезабеспячэнні насельніцтва.



**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Каля вытокаў стварэння стаялі дэпутаты папярэдняга склікання. Яны сталі першапраходцамі, і тое, што імі зроблена, каштоўнае. Першапачатковая мэта — дапамагчы Саветам мясцовых дэпутатаў дадаткова самаарганізавацца, сканцэнтраваць свае высілкі на рашэнні фінансавых, эканамічных і іншых праблем — дасягнутая. Праводзіліся нарады, семінары, разглядаліся надзённыя праблемы, рабілася спроба сфармуляваць актуальныя пытанні, якія сёння стаяць перад дэпутацкім корпусам. Быў створаны разліковы рахунак, на жаль, сродкі, якія на ім акумуляваліся, не вельмі вялікія. Але яны дазволілі правесці шэраг дабрачынных акцый ад імя дэпутатаў.

**Анатоль МАЦЮЛІН, старшыня Чавускага раённага Савета дэпутатаў, старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў:**



— Да 2010 года такой формы работы, як асацыяцыя, наогул не было. І тое, што зараз існуе дадатковая магчымасць аб'яднацца «па інтарэсах», вельмі добра. Сёння насельніцтва лічыць, што ўсе спрэчныя пытанні павінна вырашаць улада. Нават тыя, дзе можна было б абысціся сваімі сіламі. А гэта чыстай вады ўтрыманства. Трэба пераламаць гэтае меркаванне. І тут вялікія спадзяванні ўскладаем на нашых актывістаў на месцах. Яны з'яўляюцца прыкладам для сваіх землякоў, і ад іх дзеянняў шмат што залежыць. Асацыяцыя — менавіта тая арганізацыя, праз якую мы разам зможам вырашыць нейкія асобна ўзятыя пытанні, выпрацаваць агульныя варыянты дзеянняў. Цяпер мы маем магчымасць заахвоціць сваіх памочнікаў яшчэ і рублём.

*— Якія задачы ставіць перад сабой асацыяцыя сёння?*

**Дзмітрый Харытончык:**

— Галоўнымі задачамі асацыяцыі былі і застаюцца — стварэнне выразнай фінансавай асновы за кошт прыцягнення дадатковых сродкаў, пошукі новых падыходаў і метадаў для вырашэння праблемных пытанняў у раёнах, распрацоўка плана работы і кантроль за яго выкананнем. Мы павінны актыўна праз органы тэрытарыяльнага самакіравання ўцягваць у работу насельніцтва. Усё гэта будзе спрыяць развіццю раёнаў.

**Анатоль Мацюлін:**

— Гэта вывучэнне праблем і падтрымка органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, іншых грамадскіх фарміраванняў, якія сумесна з дэпутацкім корпусам вырашаюць пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва. Гэта тыя людзі, якія дапамагаюць уладзе выконваць сацыяльныя стандарты, своечасова інфармуюць мясцовыя выканаўчыя і прадстаўнічыя органы. Трэба падымаць аўтарытэт гэтых людзей. Будзе створаны так званы сакратарыят асацыяцыі для каардынацыі дзейнасці органаў грамадскага самакіравання, работы над выкананнем тых задач, якія асацыяцыя запланавала. У яго складзе будзе працаваць бухгалтар, які зоймецца кантраляваннем нашага фінансавага складніка. Будзем шукаць спосабы вырашэння праблем сваімі сіламі, аналізаваць, наколькі танней гэта зрабіць намаганнямі дэпутатаў, неабыякавых людзей і нейкіх базавых прадпрыемстваў. Бо паставіць задачу ўладзе, каб яна вырашыла праблему, гэта адно, а вось як мы зможам зрабіць гэта самі. Каб падтрымаць нашых памочнікаў, плануем на 2019 год закласці фінансаванне і па прынцыпе міжнародных арганізацый, якія выдзяляюць гранты, заахвочваць людзей.

*— Якім вы бачыце далейшы лёс асацыяцыі?*

**Дзмітрый Харытончык:**

— Першарадная задача — устанавіць стабільную крыніцу даходаў. Пры сустрэчах з насельніцтвам дэпутат становіцца сувязным звяном паміж выбаршчыкамі і выканаўчай уладай. Па сутнасці, у дэпутата няма ніякага фінансавага рычага для вырашэння тых ці іншых пытанняў. А людзі вельмі часта закранаюць глабальныя праблемы, для рэалізацыі якіх патрэбны вялікія сродкі. Сёння вельмі шмат існуе грантаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі, трэба вучыцца іх прыцягваць і развіваць свае тэрыторыі. Каб дасягнуць рэальнага выніку работы, неабходна спачатку сканцэнтраваць высілкі на нейкіх пэўных кірунках, а далей, развіваючы астатнія, павышаць актыўнасць работы асацыяцыі.

**Анатоль Мацюлін:**

— Будзем і надалей захоўваць аб'яднальны пачатак — правядзенне спартакіяд. Зараз рыхтуемся да зімовай, каб правесці ў студзені — лютым. Гэта згуртоўвае людзей. Працуем адначасова з усімі праектамі ПРААН, прыцягваем сродкі. На карысць пойдзе стварэнне так званага сакратарыята, пра які я казаў вышэй, адкрыццё свайго сайта, стварэнне лагатыпа — так мы будзем пазнавальнымі. Што датычыцца органаў самакіравання, плануем распрацаваць палажэнне спаборніцтваў.

Плануем вывучаць вопыт расіян. У іх існуе пералік крытэрыяў, па якіх ацэньваецца работа дэпутатаў. У Расіі ёсць розныя варыянты асацыяцый, якія заснаваны на пэўных інтарэсах. Нам трэба падняць актыўнасць грамадзян і пашукаць грошы ў сябе, захаваць маёмасць, якая нам дасталася. Заканадаўства дазваляе, каб мы бралі частку адказнасці на сябе. Гэта і ў плане навядзення парадку на зямлі, і работы з пустуючымі дамамі. Калі мы кажам пра асацыяцыю, маем на ўвазе аб'яднанне людзей па інтарэсах. У Гродне, напрыклад, па іншым прынцыпе аб'ядналіся, чым у нас, але кожны шукае варыянты падняцця аўтарытэту органаў самакіравання на месцах, каб яны самі былі гаспадарамі.

**Андрэй КІБЛОЎ, старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў:**



— У рамках дзясятай канферэнцыі парадпнёных гарадоў Беларусі і Германіі, якая нядаўна адбылася ў Германіі, мы з прадстаўнікамі гарадоў-пабрацімаў абмяркоўвалі магчымасць вывучэння вопыту работы нашай асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў і падобнага фарміравання з нямецкага боку. Цікавіліся, на якіх прынцыпах будуецца такая работа ў іх, казалі пра свае праблемы і вырашылі, што адным з кірункаў супрацоўніцтва з параднёнымі гарадамі будзе развіццё і гэтай тэмы. Яна вельмі важная для нас і для нашых суседзяў.

А яшчэ, на мой погляд, у асацыяцыю трэба актыўна прыцягваць бізнес, гэта дапаможа ажыццяўляць яе непасрэдныя функцыі. На сёння сфарміраваны падрабязны план дзеянняў на наступны год, які складаўся з канкрэтных прапаноў. Спадзяёмся, што ўсё задуманае ажыццявіцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЕРКАВАННЕ

**Міраслаў КОБАСА, старшыня праўлення асветніцкага грамадскага аб'яднання «Фонд імя Льва Сапегі»:**



— Шмат хто ў асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў бачыць структуру, якая працуе на прыцягненне інвестыцыйных праектаў. Так, гэта адзін з кірункаў дзейнасці, але асноўная ідэя не ў гэтым. І ўвогуле, нам сёння не хапае разумення мэт і задач асацыяцыі. Тут неабходна дадатковае тлумачэнне.

Сітуацыя з мясцовымі Саветамі сёння такая, што ў іх фактычна не хапае ні фінансавых, ні кадравых рэсурсаў. Таму рэалізаваць тое, што напісана ў законе пра паняцце мясцовага самакіравання праблематычна. Дзе тады выйсце?

Але найлепшы замежны вопыт краін Цэнтральнай Еўропы (Польшча, Чэхія, Венгрыя), Скандынавіі (Швецыя, Данія, Фінляндыя) дэманструе, што мясцовае самакіраванне павінна быць больш развітое. Гэта азначае, што чым больш мясцовае самакіраванне самастойнае, самадастатковае і дасканалае, тым больш высокім і больш якасным з'яўляецца ўзровень жыцця і дабрабыту грамадзян.

Людзям трэба тлумачыць, што сапраўднае эфектыўнае мясцовае самакіраванне — не міф, а рэальнасць, якая заснавана на іх ініцыятыве і адказнасці. Што мясцовае самакіраванне — гэта іх права і рэальная магчымасць самастойна вырашаць мясцовыя пытанні, але гэта таксама адказнасць кожнага за тых людзей, якіх мы абіраем дэпутатамі, за тыя рашэнні, якія імі будуць прымацца, у тым ліку па распараджэнні агульнай камунальнай уласнасцю і бюджэтнымі сродкамі, гэта непасрэдны ўдзел у працэсе прыняцця рашэнняў.

Зноў спытаем, хто павінен давесці спадзяванні супольнасці грамадзян да самых вярхоў і якім чынам? Кожны Савет будзе дзейнічаць паасобку? Напэўна, не! Хтосьці павінен акумуляваць і выказваць агульную волю органаў мясцовага самакіравання і там, дзе ёсць заганы і праблемы, рабіць усё, каб яны былі ліквідаваныя. На пытанне «Хто гэта зробіць?» ёсць адказ «Асацыяцыя!».

Другая функцыя — адукацыйна-кансультацыйная, трэцяя — развіццё міжнароднай дзейнасці. Навошта нам вынаходзіць кожнага разу ровар, калі ён ужо прыдуманы? З аднаго боку, нам трэба вывучаць станоўчы міжнародны вопыт і ўкараняць яго ў Беларусі з улікам існуючых у нас асаблівасцяў, з другога — засцерагчыся ад відавочных і прыхаваных памылак.

Чацвёртая функцыя — гэта інвестыцыі ў інтэлект праз арганізацыю адукацыйнай дзейнасці (семінары, круглыя сталы, канферэнцыі, навучальныя візіты, стажыроўкі) і грашовыя праекты (за перамогай у конкурсе ідуць і сродкі).

Калі грамадская арганізацыя, як наша, на рэалізацыю міні-праектаў ТАНДЭМ змагла ў суме прыцягнуць паўмільёна еўра, то такога роду орган, як асацыяцыя, можа за адзін праект прыцягнуць суму, над якой мы працавалі сем гадоў. Бо яна будзе прадстаўляць публічную галіну ўлады ўсёй краіны, калі весці гаворку аб Нацыянальнай асацыяцыі.

Яшчэ адна функцыя — абарона правоў і законных інтарэсаў сваіх членаў.

Самакіраванне — гэта публічная ўлада, якая не ўваходзіць у сістэму дзяржаўных органаў. Але гэтую самастойнасць ні ў якім выпадку не варта ўспрымаць як адасобленасць або як структуру, накіраваную на супрацьстаянне.

Тут трэба разумець, што ўся эвалюцыя чалавецтва — спрадвечная барацьба ідэй: хтосьці прапануе адно, хтосьці нешта іншае, і ў выніку аб'яднання ідэй нараджаецца трэцяя ідэя — новая і лепшая. Гэты доўгі шлях трэба прайсці.

Асацыяцыя павінна ўдзельнічаць ва ўсіх вызначальных рашэннях, якія датычацца інтарэсаў самакіравання, і яна па гэтых рашэннях павінна быць завадатарам.

Яшчэ адно важнае пытанне. На сёння дзве першыя асацыяцыі (Гродзенская і Магілёўская) былі сфарміраваны па тэрытарыяльным прынцыпе. Што гэта азначае?

Кожны дэкларуе, што ў рамках сваёй вобласці будзе рабіць усё, каб у нас было лепш за ўсіх. Але калі ў кожнай з шасці абласцей будзе створана свая асацыяцыя і кожная будзе імкнуцца дасягнуць найлепшага выніку ў сваёй асобна ўзятай вобласці, а «пірог», фігуральна кажучы, адзін, — то падобная сітуацыя не будзе дзейнічаць на кансалідацыю, а наадварот. А значыць, і кансэнсусу будзе дабіцца цяжэй, і эфектыўнасць будзе ніжэй. А калі фарміраваць асацыяцыі не па тэрытарыяльным прыкмеце, а па ўзроўні інтарэсаў (абласныя Саветы аб'ядноўваюцца ў адну структуру, раённыя — у іншую) — то эфект, на маю думку, будзе больш істотны.

З ПОШТЫ «МС»

# «НІ ПРАЙСЦІ, НІ ПРАЕХАЦЬ...»

## Карэспандэнт «МС» высвятляў, чаму ў Мінскім раёне 1700 «нічыйных» кіламетраў дарог

**Марына Барэйша з мужам і дваімі маленькімі дзеткамі здымалі кватэру. Як і любой сям'і, надакучыла жыць на чужых «квадратах». Хацелася займець свой куток. І яны вырашылі будавацца.**

— Спачатку мы наведалі Калодзішчанскі сельсавет, дзе нам прапанавалі некалькі ўчасткаў. Але варыянт нас не задаволіў, паколькі па дакументах там не было камунікацый. У 2015 годзе набылі ўчастак з аўкцыёна ў вёсцы Ляхаўшчына Ждановіцкага сельсавета. Па дакументах значылася, што да яго падведзены газ, электрычнасць. На самай справе нічога гэтага не аказалася.

Марына і Аляксандр скааперавaліся разам з суседзямі і за свае сродкі выклікалі геадэзістаў, склалі каштарысную дакументацыю, зрабілі адпаведны праект на падводку электрычнасці. Здавалася б, праблема вырашана — заставалася толькі падключыць лінію да трансфарматара. Але ім не давалі дазвол, паколькі яго магутнасці не былі разлічаны на дадатковую нагрузку. Грамадзянам прапанавалі купіць трансфарматар за ўласныя грошы. А каштуе ён нямала — каля пяці тысяч рублёў. І людзі адмовіліся. Праўда, знайшоўся «дачнік», які за свой кошт набыў і ўстанавіў гэтае абсталяванне. Свет гарыць, лінія прынятая на баланс электрасетак.

Што датычыцца ацяплення, то дом абагравaецца катлом на цвёрдым паліве. «У вёсцы яшчэ раней быў створаны кааператыў. Але мы не можам бясплатна падключыцца да газаразмеркавальнай трубы, людзі ж трацілі немалыя сродкі, каб у іх дамы прыйшло «блакітнае паліва». І мы павінны заплаціць кааператыву і сельсавету. Акрамя таго, неабходна купіць трубы, абсталяванне. Збяром крыху грошай і падключымся да цэнтральнага газазабеспячэння», — кажа Марына.

Але гэта ўсё дробязі ў параўнанні з тым, што да ўчастка Барэйшаў няма пад'язных шляхоў. Справа ў тым, што дом знаходзіцца ў другім радзе ад галоўнай дарогі. І гаспадары маглі пад'язджаць да яго толькі праз участак суседа. «Дзякуй, што ён быў не супраць. Але цяпер прывёз бетонныя блокі для пабудовы, і шляхі адрэзаны, — кажа мая суразмоўніца. — Але ўзнікае праблема: як нам трапіць дамоў?

> Ды і чаму мы павінны плаціць са сваёй кішэні за тое, што павінна быць? Па заканадаўстве, калі чалавек набывае ўчастак пад індывідуальную забудову, да яго павінны быць падведзены камунікацыі.

Сапраўды, сітуацыя не з прыемных: толькі верталёт выклікай. І хоць дарогу, абы, як кажуць, «народную» сцежку, «пратаптала» тэхніка з другога боку ад уладанняў суседа пры будаўніцтве, праехаць па ёй немагчыма. Побач — пажарны вадаём, які падчас дажджоў, вясновага разводдзя выходзіць з берагоў і затапляе нешырокую дарогу. Больш таго, участак знаходзіцца ў нізіне і на яго сцякаюць воды з калгаснага поля.



Так выглядала дарога восенню.

Марына непакоіцца. Праз два месяцы ёй нараджаць трэцяе дзіця. Ні хуткая дапамога, ні ўрачы не змогуць пад'ехаць да дома. Цяпер, калі падмарозіла, сюды можна дабрацца па калдобінах ды выбоінах. А вось калі адпусцяць маразы, тэрыторыя будзе нагадваць суцэльнае балота. Дзяцей Марына возіць у дзіцячы сад у Мінск. Без гумовых ботаў тут не абыдзешся. А насіць малых на руках хударлявая жанчына не ў сілах. Тым больш цяпер, калі цяжарная.

Куды толькі не звярталася сям'я па дапамогу. Але ва ўсіх інстанцыях знаходзіліся аб'ектыўныя прычыны. У сельвыканкаме адказалі, што няма на гэта грошай, маўляў, рабіце дарогу за свой кошт або чакайце. А чакаць можна і некалькі гадоў.

— Мы падсыпалі гэтую дарогу, як змаглі, але ўсё асела і вярнулася на кругі свае, зноў лужыны і гразь. Каб прывесці яе ў належны стан, неабходна падняць як мінімум на метр. А гэта, па нашых падліках, дзесяць дваццацітонных машын грунту. Адна абыходзіцца ў 200 рублёў. Такіх грошай у нас няма. Муж працуе ўрачом-хірургам, зарплата ў яго невялікая, я — у дэкрэтным адпачынку. Ды і чаму мы павінны плаціць са сваёй кішэні за тое, што павінна быць? Па заканадаўстве, калі чалавек набывае ўчастак пад індывідуальную забудову, да яго павінны быць падведзены камунікацыі, — абураецца Марына.

Звярталася яна і да дарожнікаў са сваёй праблемай. У ДРБУ-194 ёй растлумачылі, што абслугоўваюць толькі галоўныя дарогі. Налета яны будуць асфальтаваць цэнтральную вуліцу, што вядзе праз Ляхаўшчыну. А дарогі, што прылягаюць да ўчасткаў, — гэта не іх справа. Максімум, што могуць, — уладкаваць з'езды на два метры ад асноўнай артэрыі.

Пасля таго як да праблемы падключылася «МС», на месца выехалі прадстаўнікі Ждановіцкага сельвыканкама, Мінскага райвыканкама і «Гаррамаўтадара».

Марыне абяцалі знайсці арганізацыю і даручыць упраўленню капітальнага будаўніцтва райвыканкама распрацаваць праект. Пасля таго як будуць праведзены геалагічныя пошукі, зроблены сам праект, экспертыза, можна пачаць будаўніцтва дарогі. Але падрыхтоўчы працэс зойме не менш чым паўгода. Калі зверху насыпаць грунт, то гэта проста закопванне грошай. Сям'ю просяць пацярпець, пакуль зробяць усё належным чынам. А ў найбліжэйшы час сюды накіруюць спецыяльную тэхніку, каб неяк уладкаваць дарогу. Ва ўсялякім выпадку, так абяцаюць. У сваю чаргу «МС» будзе адсочваць, як у далейшым будзе развівацца сітуацыя.

Чаму ж нельга было раней правесці неабходныя работы? У Мінскім раёне 1700 кіламетраў дарог, якія не стаяць ні на чым балансе. Цяпер у гэтай справе наводзіцца парадак, складаецца спіс «нічыйных» дарог. Яны перадаюцца на абслугоўванне канкрэтным арганізацыям. Нарэшце ў людзей з'явілася надзея на паляпшэнне стану транспартных артэрый. Аб праблеме абласныя ўлады ведаюць і прыкладаюць намаганні, каб прывесці шляхі ў належны выгляд. Практычна на кожным прыёме грамадзян да старшыні Мінаблвыканкама Анатоля Ісачанкі звяртаюцца людзі з нараканнямі на дрэнны стан дарог. На адным з прыёмаў, у прыватнасці, губернатар адзначыў, што ў 2018 годзе на будаўніцтва транспартнай інфраструктуры ў раёнах індывідуальнай забудовы Мінскага раёна выдзелена каля васьмі мільёнаў рублёў. Аднак адрамантаваць усё за раз немагчыма. Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна неаднаразова падкрэсліваў, што асаблівую ўвагу будуць аддаваць дарогам Мінскага раёна: «Мы крыху зробім упор менавіта на Мінскі раён, таму што тут шмат застарэлых праблем. Але гэта не значыць, што ў другіх раёнах не будзем нічога рабіць. Вобласць павінна развівацца раўнамерна».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# НА КАРЫСЦЬ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

## Шэраг рашэнняў зацвердзілі дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета на мінулай сесіі

### Неабходнае абсталяванне...

У межах удзелу ў праектах міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў Гродзеншчыне рэалізуецца цэлы шэраг карысных і накіраваных на паляпшэнне якасці жыцця насельніцтва спраў. Адной з галоўных умоў іх рэалізацыі з'яўляецца фінансавы ўдзел беларускага боку ў памеры 10 % ад сумы выдаткаў донара. Каб мець падставы для выдзялення неабходных грошай, народныя абраннікі павінны зацвердзіць гэта сваім рашэннем. Так, на мінулай сесіі аблсавета былі прынятыя станоўчыя рашэнні па суфінансаванні двух праектаў міжнароднай фінансавай дапамогі.

Напрыклад, у межах рэалізацыі праекта «Паляпшэнне трансгранічных медыцынскіх паслуг у анкалагічнай уралогіі ў рэгіёнах Беластока і Гродзенскай вобласці» праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Беларусь — Украіна 2014—2020» Гродзенская абласная клінічная бальніца зможа набыць спецыялізаванае абсталяванне для лячэння пацыентаў з анкаўралагічнымі захворваннямі.

— Вынікі праекта будуць садзейнічаць развіццю грамадскай аховы здароўя, скарачэнню часу непрацаздольнасці, зніжэнню колькасці ўскладненняў і сацыяльных выдаткаў лячэння, павышэнню ўзроўню медыцынскіх паслуг, — растлумачыла дэпутатам сутнасць праекта **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення аховы здароўя аблвыканкама Вольга МАСЦІЦКАЯ.** — Агляды і аперацыйныя ўмяшанні набудуць новы стандарт якасці і бяспекі.

Сума суфінансавання складае крыху больш за 78,5 тысячы еўра ў эквіваленце.

Другі праект таксама накіраваны на забеспячэнне якасці жыцця насельніцтва ў прыгранічным рэгіёне Польшчы і Беларусі праз павышэнне ўзроўню бяспекі грамадзян, маёмасці і навакольнага асяроддзя. У межах той жа праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва прадугледжваецца набыццё беларускім бокам пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі, пажарна-тэхнічнага ўзбраення і абсталявання. Вядучымі партнёрамі ў праектах «Новы падыход да трансгранічнай сістэмы кіравання надзвычайнымі сітуацыямі» і «Сумесныя ініцыятывы па павышэнні бяспекі трансгранічнай вобласці ў выніку экалагічных і хімічных катастроф» выступаюць дзве гміны Падляскага ваяводства. Агульны бюджэт складае больш за тры мільёны еўра, на рэалізацыю праекта Гродзенскаму абласному ўпраўленню МНС з улікам суфінансавання з беларускага боку выдзяляюць амаль паўтара мільёна.

Безумоўна, абодва гэтыя праекты народныя абраннікі падтрымалі аднагалосна.

### ...і бясплатны праезд для школьнікаў

Адпаведнае рашэнне дэпутаты зацвердзілі яшчэ ў кастрычніку, але спатрэбілася яго карэкціроўка. З ініцыятывай аб пашырэнні дзеяння бясплатнага праезду для школьнікаў з 1 верасня да 30 чэрвеня звярнуліся бацькі вучняў, што жывуць у мікрараёне індывідуальнай забудовы Каробчыцы, які знаходзіцца непадалёк ад абласнога цэнтра, а навучаюцца ў гарадскіх установах адукацыі. Справа ў тым, што тэрытарыяльна яны адносяцца да Гродзенскага раёна і карыстаюцца прыгарадным грамадскім транспартам. Пашырыць дзеянне папярэдняга рашэння на школьнікаў усяго раёна — больш правільная мера ў дачыненні да навучэнцаў, што вучацца ў Гродне, а жывуць побач з ім, так вырашылі народныя абраннікі і зацвердзілі гэта на сесіі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# З УЛІКАМ УСІХ ЖЫЦЦЁВЫХ АБСТАВІН

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)***

Спартсмены, уключаныя ў спісачныя саставы нацыянальных і зборных камандаў Беларусі, навучэнцы спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў, дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ падпадаюць пад катэгорыю занятых у эканоміцы. Роўна як і жыхары краіны, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме ці дома (выключэнне — дадатковыя курсы і трэнінгі).

Не ўзнікне пытанняў да тых, хто выхоўвае дзяцей да сямі гадоў, дзяцей з інваліднасцю да 18 гадоў, траіх і больш непаўналетніх. Калі вы афіцыйна зарэгістраваны ў якасці беспрацоўнага або праходзіце перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі па накіраванні органаў па працы, то таксама лічыцеся занятымі.




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Каго яшчэ не будуць уносіць у базу?

Ёсць шэраг выпадкаў, калі грамадзян, якія не працуюць, не будуць адносіць да ліку не занятых у эканоміцы. Напрыклад, на працягу квартала, пасля таго як работнік быў звольнены. Калі ж кантракт скасавалі з-за скарачэння штата, неадпаведнасці спецыяліста пасадзе, якую ён займаў, праз стан здароўя, заканчэння тэрміна дзеяння кантракта, то ў вас ёсць «адтэрміноўка» на паўгода.

Вайскоўцаў, работнікаў ваенізаваных арганізацый, з якімі былі перапынены ўказаныя адносіны, рэзервістаў і ваеннаабавязаных пасля праходжання збораў на працягу шасці месяцаў таксама не будуць заносіць у спіс незанятых. А тыя, хто адвучыўся на дзённым аддзяленні, дома або ў духоўнай семінарыі, атрымаюць «адтэрміноўку» да канца каляндарнага года, у якім яны выпусціліся з альма-матар.

У базу не трапяць і прызнаныя судом недзеяздольныя, грамадзяне з інваліднасцю, тыя, хто мае права на пенсію па страце карміцеля ў сувязі з няшчасным выпадкам на вытворчасці ці прафзахворваннем або сам атрымлівае страхавыя выплаты пасля траўмы на рабоце. А таксама жыхары краіны, якім налічваюць пенсіі і дзяржаўныя дапамогі (за выключэннем аднаразовых дапамог).

Незанятымі не лічацца алімпійскія чэмпіёны, якім выплачваюць дзяржаўную стыпендыю, тыя, хто здае ў арэнду памяшканні і машына-месцы (пры ўмове аплаты падаходнага падатку). Дэкрэт не закране сужэнцаў вайскоўцаў і маладых спецыялістаў, калі ў мясцовасці, дзе яны жывуць, няма магчымасці працаўладкавацца.

Сярод грамадзян, якіх не будуць уключаць у базу, таксама жанчыны, што знаходзяцца пад медыцынскім наглядам падчас цяжарнасці і родаў, гараджане і вяскоўцы, адпраўленыя на прымусовае лячэнне, у месцы пазбаўлення волі (ці пад хатні арышт), лячэбна-працоўныя прафілакторыі.

Дарэчы, калі вы працуеце або вучыцеся за мяжой, то таксама не будзеце аплачваць «камуналку» па стапрацэнтным тарыфе.

### Як фарміруецца база даных?

Туды запісваецца наступная інфармацыя: імя, прозвішча, імя па бацьку незанятага грамадзяніна, яго дата нараджэння, пол, грамадзянства, звесткі аб рэгістрацыі па месцы жыхарства (знаходжання), від, серыя і нумар дакумента, які сведчыць асобу, ідэнтыфікацыйны нумар.

База фарміруецца кожныя паўгода і ўдакладняецца раз у квартал. Перадаваць інфармацыю для яе могуць дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі — пры дапамозе адмысловай электроннай паслугі. Цяпер таксама распрацоўваецца праграма, праз якую жыхары краіны змогуць даведацца, ці трапілі яны ў базу.

На месцах з незанятымі грамадзянамі працуюць пастаянныя камісіі. У іх склад увайшлі дэпутаты, спецыялісты выканкамаў, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, прадпрыемстваў раёна. Пасяджэнні праводзяцца па неабходнасці, але не радзей за два разы на месяц. Камісіі паведамляюць людзям аб тым, што тыя трапілі ў спіс, дапамагаюць падбіраць вакансіі, займаюцца рэсацыялізацыяй асоб, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. А грамадзян, якія аказаліся ў цяжкіх жыццёвых сітуацыях, могуць цалкам ці часткова пазбавіць ад аплаты паслуг па поўным тарыфе.

### Што адносіцца да цяжкіх жыццёвых сітуацый?

Такія сітуацыі можна ўмоўна падзяліць на чатыры блокі. Першы — стан здароўя. Напрыклад, наяўнасць у чалавека захворвання, якое з'яўляецца паказаннем да ўстанаўлення інваліднасці, але яна з нейкіх прычын пакуль што не афармлена, працяглае аднаўленне пасля траўмы, праходжанне курса лячэння і рэабілітацыі ад нарказалежнасці.

Другі блок — неабходнасць догляду дзяцей, старэйшых за сем гадоў. Напрыклад, школьнік стаіць на дыспансерным уліку з хранічным захворваннем, навучаецца дома пасля хваробы. Трэці блок — неабходнасць пастаяннага ці часовага догляду дарослых непрацаздольных грамадзян. Чацвёрты — адсутнасць магчымасці працаўладкавання. Тут могуць быць такія аб'ектыўныя прычыны, як значная аддаленасць месца жыхарства ад органаў тэрытарыяльнай службы занятасці, нерэгулярная транспартная сувязь, адсутнасць вакансій па спецыяльнасці.

Да цяжкіх жыццёвых сітуацый адносяць і некаторыя іншыя выпадкі. Напрыклад, прычыненне шкоды здароўю, маёмасці ў выніку стыхійных бедстваў, пажараў, надзвычайных сітуацый. Прычынай, праз якую дазваляецца вызваліць ад поўнай аплаты паслуг, можа стаць пераезд на новае месца жыхарства ці страта сацыяльных сувязяў падчас адбывання пакарання, прымусовага лячэння, рэабілітацыі.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны падкрэсліваюць, што гэты пералік прыкладны, ён не закрыты. У камісіі застаецца права прымаць рашэнне па кожнай канкрэтнай сітуацыі.

### Якія паслугі падаражэюць для ўтрыманцаў?

Не занятыя ў эканоміцы грамадзяне з 1 снежня 2019 года будуць аплачваць па стапрацэнтным тарыфе гарачую ваду, а з 1 кастрычніка наступнага года — газ (пры наяўнасці індывідуальных газавых ацяпляльных прыбораў) і ацяпленне. Цяпер насельніцтва кампенсуе каля 80 % затрат на электраэнергію і 20 % — на цеплавую.

Тут ёсць некалькі нюансаў. Папершае — налічваць «камуналку» па поўнай будуць у тым выпадку, калі непрацуючы з'яўляецца ўласнікам, наймальнікам ці арандатарам жылога памяшкання, членам арганізацыі-забудоўшчыка, лізінгаатрымальнікам або заключыў дагавор долевага будаўніцтва. На беспрацоўнага, які жыве ў кватэры, дзе плацельшчыкам лічыцца іншы чалавек (яго маці, напрыклад), павышаныя тарыфы не распаўсюджваюцца.

Па-другое — аплачваць паслугі ў стапрацэнтным памеры незанятаму грамадзяніну давядзецца толькі за сябе. Для астатніх зарэгістраваных жыхароў кватэры нічога не зменіцца.

Міністэрства ЖКГ раней прыводзіла разлік таго, як можа вырасці «камуналка» для тых, хто трапіць у базу. Напрыклад, у двухпакаёвай кватэры плошчай 48 м² на падагрэў вады было затрачана 0,6 Гкал, а на ацяпленне зрасходавана 1,2 Гкал. Калі ў ёй пражывае тры чалавекі і ўласнік — беспрацоўны, то аплата за гарачую ваду павялічыцца на 5—6 рублёў, а за абагрэў — на 15. Калі б незаняты ўласнік жыў у такой кватэры адзін, то кошт за ацяпленне вырас бы на 60 рублёў.

Дапусцім, гэтае ж памяшканне абсталявана газавым ацяпляльным прыборам. За месяц зрасходавана 150 м³ газу. Пры ўмове, што там зарэгістравана трое жыхароў і ўласнік сядзіць без работы, жыроўка «пацяжэе» прыкладна на 15—16 рублёў. Калі незаняты ўласнік жыве адзін, то газ для яго падаражэе на 40 рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

## Дзе шукаць працу?

**Пастаянна дзеючая камісія па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва Валожынскага райвыканкама працягвае сваю работу па працаўладкаванні працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы.**

Нядаўна ў будынку Івянецкага пасялковага выканаўчага камітэта адбылося чарговае пасяджэнне камісіі, на якім прысутнічалі дванаццаць яе членаў і пяць кіраўнікоў арганізацый і прадпрыемстваў, што размяшчаюцца на тэрыторыі пасёлка і Івянецкага сельсавета, паведамляе раённая газета Валожыншчыны «Працоўная слава».

Па дапамогу звярнуліся дзесяць чалавек. Чатыры адразу атрымалі накіраванне на працу дзякуючы таму, што з кіраўнікамі загадзя было вывучана пытанне па вакансіях, якія з'явяцца ў найбліжэйшы час. Яшчэ двое прэтэндэнтаў рабочыя месцы атрымаюць на працягу месяца. Астатнім была дадзена юрыдычная кансультацыя па працаўладкаванні ў рамках выканання Дэкрэта № 3.

Між іншым, інфармацыю аб працаўладкаванні можна атрымаць на сайце райвыканкама: http://www.volozhin.gov.by. У раздзеле «Сацыяльная сфера» трэба выбраць «Сацыяльная абарона», далей — «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва». Тут жа можна даведацца аб наступных пасяджэннях пастаяннай камісіі. Дарэчы, яны праходзяць у будынку райвыканкама кожны другі і чацвёрты чацвер месяца з 15 да 17 гадзін.

## Навучаць аграбізнесу

**У Аршанскім рэгіёне стартуе сацыяльны праект для сельскіх жанчын. Як падаць заяўку?**



Беларускі дзіцячы фонд сумесна з мясцовым райвыканкамам запускае сацыяльны дабрачынны праект «Навучанне жанчын Аршанскага раёна асновам аграбізнесу, прадукцыйнаму выкарыстанню зямельных участкаў для атрымання дадатковага даходу для сям'і, адкрыцця малога бізнесу і ўключэнню ў працэс самазанятасці», паведамляе «Аршанская газета».

Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца ініцыятыўныя і працаздольныя жанчыны раёна, якія маюць свае прысядзібныя ўчасткі, якія гатовы атрымліваць дадатковыя веды ў галіне аграбізнесу і ўжываць іх у працы на сваіх участках, атрымліваючы дадатковы даход для сваёй сям'і.

У рамках праекта жанчыны змогуць атрымаць карысныя парады ад бізнесменаў, якія практыкуюць у галіне малога прадпрымальніцтва ў аграрнай сферы.

Пакінуць заяўку патэнцыйным удзельніцам прапануюць па тэлефоне: 8 (0216) 51-03-91, а таксама па адрасе: г. Орша, вул. Леніна, д. 43, кабінет № 19.



КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

## Ці хвалюе людзей праблема бытавога смецця?

**Сёння мы падводзім вынікі нашай першай апытанкі, прысвечанай гэтай тэме.**

Праблема бытавога смецця хвалюе 94,1 % рэспандэнтаў, 5,8 % адказалі на гэта пытанне адмоўна. Найбольш значным у праблеме ўтылізацыі смецця амаль 77 % апытаных палічылі забруджванне планеты; 16 % выбралі варыянт «чысціня ў двары або ў горадзе»; 6,5 % наведвальнікаў нашага сайта выказаліся, што гэта яшчэ адна магчымасць зарабіць грошы.

Таксама былі прапанаваны варыянты адказу на пытанне, што трэба зрабіць для таго, каб паўсюдна ўвесці раздзельны збор смецця. Тут меркаванні ўжо раздзяліліся. Крыху менш за палову апытаных лічаць, што трэба павышаць агульную культуру людзей. За прапановы ставіць больш спецыяльных кантэйнераў і быць больш патрабавальнымі да сябе і членаў сваёй сям'і выказаліся прыкладна па чвэрці наведвальнікаў. А вось за павелічэнне колькасці дворнікаў не выказаўся амаль ніхто.

Тры чвэрці тых, хто прагаласаваў, жывуць у сталіцы або ў адным з абласных цэнтраў. У невялікім раённым горадзе — 17,6 %. Яшчэ 5,9 % маюць вясковую рэгістрацыю. Што да ўзроставай стратыфікацыі, то крыху больш за трэць апытаных — моладзь ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў. Крыху меней было тых, каму ад 30 да 45.

### Наш інтэрактыўны праект з чытачамі працягваецца. Даведацца, наколькі мы «экасвядомыя», можна з нашай новай апытанкі

***Ці сартуеце вы смецце дома?***

☐ Так, я прыхільнік раздзельнага збору смецця.

☐ Не, але хацеў бы.

☐ Не, і не планую ніколі.

***Ці ёсць у вашым двары смеццевыя кантэйнеры для розных відаў адходаў (пластык, шкло, папера і г. д.)?***

☐ Так, яны з'явіліся даўно.

☐ Не, але я нашу смецце ў суседнія двары.

☐ Не, у нашым двары стаяць толькі агульныя сметніцы.

***Ці ведаеце вы, дзе знаходзяцца ў вашым раёне пункты прыёму другаснай сыравіны?***

☐ Так, я ўвесь час адвожу туды тэхніку, макулатуру, шкло і інш.

☐ Уяўлення не маю, усё адношу на сметнік.

☐ У нас няма пункта прыёму другаснай сыравіны.

***У якім населеным пункце вы жывяце?***

☐ Мегаполіс (сталіца, абласны горад).

☐ Невялікі раённы горад.

☐ Пасёлак, аграгарадок, вёска.

***Ваш узрост***

☐ 15–20 гадоў

☐ 20–30 гадоў

☐ 30–45 гадоў

☐ 45–60 гадоў

☐ 60+

Адказаць на пытанні можна на нашым сайце zviazda.by. Для большай зручнасці скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і прыняць удзел у нашай апытанцы.

ДЗЕНЬ САВЕТА

# ТРЭБА, КАБ БЫЛО ПА-ГАСПАДАРСКУ...

## Якія пытанні хвалююць насельніцтва Запольскага сельсавета Віцебскага раёна, высвятлялі на традыцыйным Дні Савета

**Весці адкрыты і сумленны дыялог з мясцовым насельніцтвам рэкамендаваў старшыні Запольскага сельвыканкама Рыгору ШЛЫКАВУ кіраўнік дэпутацкага корпуса раёна Віктар ДАРОЖКІН пры падвядзенні вынікаў Дня Савета, паведамляе «Жыццё Прыдзвіння».**




— Сустрэчы з насельніцтвам па месцы жыхарства — практычная форма зносін з людзьмі. Для старшыні сельвыканкама гэта магчымасць даведацца, з якімі праблемамі сутыкаюцца грамадзяне ў той ці іншай мясцовасці, — лічыць Віктар Дарожкін.

Вяскоўцаў цікавілі розныя пытанні, толькі некалькі з іх маюць «глабальны» характар. Астатнія можна было вырашыць на месцы, у так званым рабочым парадку, не даводзячы іх да крытычнага стану.

— А для гэтага трэба правільна пабудаваць зносіны з людзьмі, — парэкамендаваў Рыгору Шлыкаву старшыня раённага Савета дэпутатаў.

Добрыя дарогі ў сельскай мясцовасці — гэта і камфортнае жыццё, і шырокая прастора для развіцця вёскі. Адносна транспартных артэрый Запольскага сельсавета з боку ўдзельнікаў дарожнага руху гучыць шмат нараканняў. Вяскоўцы з разуменнем фармулююць свае просьбы да дарожных арганізацый: асфальт, вядома, не «закатаць», але зрабіць падсыпку, грэйдзіраванне неабходна. Рыгор Шлыкаў адзначыў, што дапамагае мясцовая гаспадарка. Ва ўзаемадзеянні з агракомплексам імя Сільніцкага ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» атрымліваецца вырашаць нямала існуючых праблем. Зімой аграрыі бяруць на сябе абавязак па расчыстцы вуліц і дарог ад снегу. Яны дапамаглі тэхнікай падчас рамонту вуліцы Зарэчнай у вёсцы Папаратнае.

Віктар Дарожкін параіў старшыні сельвыканкама больш цесна працаваць з арганізацыямі і прадпрыемствамі, размешчанымі на тэрыторыі сельсавета. Узяць хоць бы дарожнае пытанне. Яно павінна быць зонай адказнасці не толькі Рыгора Шлыкава, але і кіраўніцтва мясцовай гаспадаркі, Суражскага лясгаса, які сваёй цяжкай тэхнікай «забівае» мясцовую дарожную сетку. «Любіш катацца — любі і саначкі вазіць!» — кажа прыказка, якая вельмі дарэчы падыходзіць для вырашэння гэтай праблемы.

У справе навядзення парадку на зямлі таксама невыразна прасочваецца гаспадарская рука суб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі сельсавета.

Старшыня райсавета дэпутатаў адзначыў, што гэтая тэма павінна была набыць асаблівае гучанне ў Год малой радзімы і заклікаць кожнага быць руплівым гаспадаром свайго домаўладання і той тэрыторыі, на якой чалавек жыве і працуе.

— Сёлета праведзена восем суботнікаў, за дзесяць месяцаў выдадзена 28 прадпісанняў грамадзянам за неналежнае ўтрыманне прыдамавой тэрыторыі і пустазелле на асабістым прысядзібным участку. Разам з работнікамі Запольскай капельні на тэрыторыі сельсавета ліквідавалі 11 несанкцыянаваных звалак, — канстатаваў Рыгор Шлыкаў.

З нагоды гэтага Віктар Дарожкін заўважыў, што чыста не там, дзе прыбіраюць, а там, дзе не смецяць. І вялікая роля тут надаецца працы на апярэджанне.

— Твар гаспадара — яго падворак. Душы прыемна і вока цешыцца, калі бачыш у нашых вёсках дагледжаныя сядзібы, дзе і дом, і гаспадарчыя пабудовы — астравок дагледжанасці і прыгажосці. Такім людзям хочацца сказаць вялікі дзякуй. Але, на жаль, ёсць нямала домаўладальнікаў, якіх неабходна падштурхоўваць да крокаў па добраўпарадкаванні прадпісаннямі, а часам нават штрафамі, — адзначыў на заканчэнне старшыня сельскага Савета.

Зямля справамі людзей славіцца. А значыць, ад кожнага залежыць, ці будзе яго родны край чыстым і дагледжаным, камфортным для жыццядзейнасці... У Год малой радзімы трэба пакінуць добры след на сваёй зямлі.




МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 29 лістапада 2018 года.**